Пскоўскі дыялект

Ян Станкевіч

Дыялект пскоўскі граніча на захадзе з моваю латыскай і эстонскай, на поўначы а паўночным усходзе — з мовай расійскай. Паўднявая граніца гэтага дыялекту з гаворкамі Віцебшчыны а Смаленшчыны паўночнага нарэчча беларускага ня выразьлівая, бо гэтае нарэчча вельмі блізкое да дыялекту пскоўскага. На паўдні граніца праходзе прыблізна ўздоўж адміністрацыйнае граніцы былых губэрняў Пскоўскае а Цьверскае з б. губэрнямі Віцебскай а Смаленскай, крыху на поўнач ад гэтае граніцы.[1]

Надабе з пэўнасьцяй вызначыць спачатную й сучасную нацыянальную прыналежнасьць дыялекту пскоўскага, бо празь яго ё сьпярэчныя пагляды. Галаўной прычынаю сьпярэчнасьці ё тое, што Пскоўшчына ўжо 450 год належа да цэнтралістычнага гаспадарства Маскоўскага (названага ў васьмінанцатым стагодзьдзю Расійскім[2]) і падпала пад моцны русыфікацыйны ўплыў. Як ні дзіўна, але на гэтую прычыну звычайна не зважаюць дасьледаваньнікі расійскія. Прымеж таго, калі ў Расіі шчэзла, абрусела шмат моваў плямёнаў фінскіх а турска-татарскіх, то як магла не паддацца русыфікацыйнаму ўплыву мова славянская Пскоўшчыны? Трэба яшчэ дзівіцца з таго апрычонага ад мовы расійскае стану, які мы назіраем у дыялекце пскоўскім.

Старую мову Пскоўшчыны галоўна дасьледавалі: а) А. Соболевский. Псковский говор в XIV веке; б) Н. Каринский. Язык Пскова и его области в XV в.; в) А. Шахматов. Несколько заметок о языке псковских памятников.

Сучасная мова Пскоўшчыны адзначана на «Диалектологической карте русского языка в Европе», выданай Маскоўскай Дыялектолёгічнай Комі-

[1] Дыялектолёґічная Комісія Маскоўская да дыялекту пскоўскага залічае гэткія мясцовасьці: паўднявыя часьці б. паветаў Гдоўскага (Гдоў) а Лускага (Луга) б. Пецярбурскае губ., б. Пскоўскую губэрню з выняткам б. пав. Порхаўскага і паўночнае часьці б. пав. Хомскага; а з б. Цьверскае губ. большую часьць б. Асташкаўскага а Ржэўскага (зь местам Ржэваю) пав. і невялікую часьць б. пав. Зубцоўскага (Дурнова-Опыт, б. 36). З гледзішча гісторычна-палітычнага дыялект пскоўскі займае прастору даўнейшае рэспублікі Вялікі Пскоў, Тарапецкі ўдзел Вялікага Княства Смаленскага і заходнюю часьць Вялікага Княства Цьверскага.

[2] У 1510 г. Масква прысабечыла рэспубліку Вялікі Пскоў, супоўна нішчачы яе апрычонае палітычнае быцьцё.

сяй, і ў прыкладзеным да гэтае мапы «Очерку русской диалектологии» празь яе кажацца ў § 47—48. Запісы асаблівасьцяў дыялекту пскоўскага ёсьць у вадказах на апытаньнікі менаванае Комісі, друкаваных у ейных «Трудох». Асобна трэба адцеміць досыць грунтоўнае апісаньне цяперашняга стану дыялекту пскоўскага К. Иеропольскага «Говор дер. Савкино Пушкинского района Псковского округа».

Сабалеўскі, разгледзеўшы ў менаванай працы мову пскоўскіх рукапісаў (асьмёх із XIV стг. і аднаго 1409 г.) прышоў да гэткіх вывадаў: «Указанные выше данные показывают, что псковский говор в XIV в. отличался от всех известных нам русских говоров того же времени. В нем были такие крупные особенности, каких не имел в XIV в. ни один русский говор, именно: частая взаимная мена **ж** и **з**, **ш** и **с**; переход **е** в **а** (даже под ударением)», бач. 155.

Праз дачыненьне дыялекту пскоўскага да мовы беларускае аўтар кажа: «С западно-русскими говорами у него были следующие общие черты: замена неударяемого **о** через **а**, замена неударяемого **е** через **и** и употребление **зд** вм. **з** в слове **борзо»** (там-жа). Апрача таго, прывёўшы прыклады на зацьвярдзелае **р**, Сабалеўскі зацеміў, што яны «указывают на то, что в псковском говоре XIV в. уже существовало то явление, которое мы наблюдаем теперь во многих малорусских и белорусских говорах, именно употребление твердого (или почти твердого) **р** вм. мягкого» (б. 154).

Пасьлей у «Лекциях по истории рус. языка» Сабалеўскі дадаў яшчэ гэткія, аднолькавыя зь беларускімі, рысы мовы Пскоўшчыны XIV стг.: 1. **в** мяняецца ў **у**, 2. мясцовы склон адз. ліку на **-у** у мужчынскіх асабавых спакменьнікаў, 3. поўнае зьмяшаньне **ѣ** і **е**, 4. 1 ас. мн. ліку **есме**.[3] Дзьве першыя рысы ў мове беларускай агульныя, дзьве другія дыялектычныя — паўночнае групы дыялектаў.

Сабалеўскі канчае сваю працу праз дыялект пскоўскі гэткім зацемам: «Из массы современных русских говоров мы не знаем ни одного, который в большей или меньшей степени был бы похожим на древний псковский и мог бы быть признаваем за его потомка. В настоящее время около Пскова говорят почти совсем так, как говорят около Новгорода». У гэтым паглядзе ня толькі ё прызнаньне факту русыфікацы дыялекту пскоўскага, але й праяўленьне недастатнага знацьця аўтарам мовы беларускае й сучаснага стану дыялекту пскоўскага.

Карынскі, апісваўшы сем памяткаў пскоўскіх XV стг., восем XIV—XV стг., адну XVI стг. і адну XVII стг. і дасьледаваўшы іх асаблівасьці, знайшоў, што дасьледаваны ім дыялетк пскоўскі XV стг. розьніцца ад дасьледаванага Сабалеўскім таго-ж дыялекту пскоўскага XIV стг. гэткімі рысамі: 1. зьліцьцём гуку **е** з гукам **і** ў складох ненацісьненых, 2. зацьвярдзелым **р**. 3. менаю **у** і **в** і складам **ув**, заменаю **ф** пераз **х**, 5. 1 ас. мн. ліку **есмо** і 6. менаю **и** і **ы**» (бб. 201—203). Напярэк Карынскаму трэба зацеміць, што праз першыя дзьве рысы сказаў блізу тое самае й Сабалеўскі.

Каб зьясьніць прычыну менаванае розьніцы памеж моваю пскоўскай XIV і XV стг., Карынскі дапушчае, што «резкие изменения в псковском языке XV в. произошли в следствие влияния на этот язык языка западнорусского (а, может быть, даже и северно-малорусского). А этот вывод веде-

[3] Карынскі, б. 199.

к предположению о колонизации белоруссов (а может быть и северно-малоруссов) в Псковскую область» (б. 203). Праз «Маларусаў», подле Карынскага, сьветча мяшаньне **ы** й **и**, а празь Беларусаў — усі засталыя менаваныя гэтта рысы.

> «Размеры предполагаемой нами колонизации белоруссов на север, — кажа далей аўтар (б. 204) — были значительны. Мы видим, что псковский язык воспринял все важнейшие западно-русские фонетические и частично даже морфологические особенности и при том, насколько можно судить по рассмотренным нами рукописям, влияние охватило всю Псковскую область (мы не нашли памятника XV в. с яркими псковскими чертами, в котором ярко не отразились бы и западно-русские особенности».

Гэтак дапушчае Карынскі, дарма што на гэта нямаш ніякіх данных гістарычных, ані археолёгічных, ані этнаграфічных; наадварот, ё даныя, пярэчачыя такому дапушчэньню. Як Палачане а Смальняне, таксама Псковічы былі Крывічы. Ноўгарадцаў «Курганныя старавечнасьці апрычаюць ад Крывічоў»[4] ды тыя-ж «Курганныя старавечнасьці XI стг. наагул пацьвярджаюць культурную суцэльнасьць усіх гэтых (Полацкіх, Смаленскіх а Пскоўскіх) Крывічоў».[4] Антраполёгічны тып Псковічаў адзін, і ён аднолькавы з антраполёгічным тыпам Беларусаў.

Дзеля таго добра кажа Шахматаў у менаванай працы: «Обращаясь к вопросу о том, прав ли Н. М. Каринский, когда об'ясняет близость псковского наречия к белорусскому движением белоруссов в Псковскую область, имевшем место в конце XIV,[5] замечу, что данных принятия для подобного об'яснения мы не имеем. Псковских памятников старше XIV в. до нас не дошло; поэтому судить о том, каков был язык Пскова XII—XIII в. и отличался ли он от позднейшего языка отсутствием белорусских черт, мы не можем. Правда, в памятниках XIV в. меньше белорусских черт, чем в XV в., но это могло стоять в связи с тем, что в XIV в. или в первой половине этого века псковская письменность находилась под прямым влиянием новгородской, между тем как со второй половины XIV в. начинается влияние на нее письменности западно-русской. Признаю большой заслугой А. И. Соболевского и Н. М. Каринского указание их на связь псковского наречия с белорусским, но вопреки Н. М. Каринскому я склонен думать, что эта связь исконная, вызванная исконным соседством псковичей и белоруссов» (б. 176—177).

Калі зьвернемся да бяссумлеўных памяткаў беларускіх XIV стг., дык пабачым у іх абраз падобны да памяткаў пскоўскіх. Карскі мяшаньне ненасісьненага **е** й **и** падаў толькі, пачынаючы з XV стг. («Белорусы», II—I, 219—220). На зацьвярдзеньне **р** мяккога Карскі падаець толькі гэткія прыклады з XIV стг.: сентебра (1395), терать (1398), Дрысы (да 1399), Дмитръ, Дворыкович (з XIV стг.), серебрыный (1405) («Белорусы», II-I, 383). З полацкіх памяткаў Хр. С. Станґ-Полацк, 18, 20, да гэтага дадаець серебрыны, серебрыных.

На замену **у** пераз **в** Карскі да XV стг. падаець толькі два прыклады — адзін із 1284 г., другі з 1349 г. («Белорусы», II—I, 290). Станґ із дасьледава-

[4] А. Е. Пресняков – Лекции по русской истории, т. I, 1938, б. 33.
[5] Карынскі запраўды часам гэтае калёнізацы ўважае XIII стг., або пачатак XIV. (б. 207).

ных ім памяткаў падаець въслышить зь лісту Альгерда з каля палавіцы XIV стт. (Kanzleisprache, II), а другі вразумѣлъ із полацкае памяткі з 1392—1415 (Полацк, 14). Прымеж таго на замену літары **в** літараю **у** Карскі падаець із XIII стт. 7 прыкладаў, дадаючы «і г. д.», з XIV стт. ён падаець 19 прыкладаў («Б.», II—I, 415). Станґ із XIV стт. на замену **в** пераз **у** падаець 14 прыкладаў (Kanzleisprache, 16, Полацк, 10, 12, 14, 18, 21, 22).

Малая колькасьць прыкладаў на некаторыя зьявы да XV стт. як у памятках із задзіночанага гаспадарства беларускага (Вялікага Княства Літоўскага), так і ў пскоўскіх, зьясьняецца, першае, тым, што, чым ранейшая пара, тым меней было пішучых, і дзеля таго яны болей захоўвалі традыцыйны царкоўна-славянскі правапіс; другое, з ранейшае пары шмат памяткаў загінула, а з тых, што захаваліся й дасьледаваныя, ня ўсі дасьледаваны даволі.

А што да розьніцы ў колькасьці ў памятках прыпадкаў замены **в** пераз **у** і замены **у** пераз **в**, то гэтаму зьясьненьне наступное. У мове беларускай пачатнае **в**, стаячае перад сутукам, і прыймя **в** пераходзе ў **ў** па самагуку пярэднята слова, а па сутуку пярэдняга слова пераходзе ў **у**; таксама **в** пераходзе ў **у** просьле паўзы. Гук **у** ніколі не пераходзе ў **в**, але ў **ў**. Другое, **ў** гучыць бліжэй да **у**, чымся да **в**; асабліва ў мове беларускай **ў** адзначаецца вялікім вокалічным элемэнтам. Дзеля таго пісары, пішучы **у з в** або **ў з в**, перадавалі пераз **у** (або **оу**) гук імі вымаўляны як (**у з в**) альбо гук блізкі да вымовы іхнае (**ў з в**); прымеж таго перадаваць **ў з в** ня мелі сяродку, ня было літары **ў**, перадаваць **ў** пераз **в** маглі толькі як абмылку, сьцерагучыся, каб не напісаць **у** замест **в**.

Што да **ув**, яно сустракаецца ў мове беларускай шмат радзей за **у** альбо **ў**, бо толькі перад пачатным **а** (спачатным або зь ненацісьненага **о**) па прыймені **у** або **ў** і тады **в** запраўды належа да пачатнага **а**, як протэза (авес, апека, акно, але: у ваўсе, у вапеццы, у вакне). А калі прыймя ў (або **у**) з **въ** стаіць перад складам із шчэзлым **ь** або **ъ**, тады можа быць (але не заўсёды мусіць быць) **ува** (або **ўва**), **уво** (або **ўво**); прыкладам: **ува ўсім** побач із **у ўсім** (абедзьве хормы з въ вьсѣмъ), уво Ршы (з въ ръши, з **уво Ршы** паўстала Ворша, бо пачалі думаць, што **во** належа тут да спакменьніка, а не да прыймені).

Радзей зьяўляючыся ў мове, склад **ув** мусіў пасьлей а меней адбіцца ў памятках, бо ў іх маем абмежаны моўны матар'ял.

На пераход **ф у х** Карскі зь беларускіх памяткаў да XV стт. падаець толькі адзін прыпадак — **хома** зь лісту 1388 г. («Б.», II—I, 433). Калі ў вапісаным Карынскім, 72, зборніку Сынодальнае бібліотэкі № 154 ё: перхуреи чернець ивана гахоновича, ивана хахиловича, ды ў Паґодзінскай копіі летапісу пскоўскага: при попѣ Иване Хахилевѣ, пархеи гахоновичь і інш. (там-жа, 85), то ясна, што ў мове пскоўскай гук **ф** перайшоў у **х**, а напісаньні з **ф** — фефилатова й інш. (там-жа) былі толькі напісаньнямі традыцыйнымі. Калі, адылі, Карынскі кажа, што ў прыкладзе **фефилатов ео** сьцягнуліся ў **е**, а ў прыкладзе хахилев і інш. не сьцягнуліся, то з гэтым нельга згадзіцца. Як у **хахилев, хахилович** зь **феофил**, так і ў **фефилатов** зь **феофилат** — сталася сьцягненьне, толькі ў першым прыпадку **ео** перайшло ў **аа** (аканьне), каторыя сьцягнуліся ў **а**, у прыпадку другім **ео** сьцягнуліся ў **е**. Розьніца, відавочна, залежала ад месца націску: калі націск быў на **е**, **ео** сьцягнуліся ў **е**, бяз націску **ео** далі **а**. Прыр. цяпераш-

нія беларускія **Хведар, Ходар,** абодвы зь **Феодор;** прыр. таксама **Тодар** з **Теодор.** Відавочна, тое самае слова мела націск на розным месцу, залежна ад мясцовасьці й звычаю вымаўленьня.

Хорму 1-ае ас. мн. л. **есме** падпаможнага дзеяслова адзначыў Сабалеўскі ўв Апостале 1307 г. Правільна Карынскі ўважае гэтую хорму за жывую пскоўскую; яна звычайная ў памятках пскоўскіх і пануе ў тых зь іх, што маюць зыркія дыялектычныя асаблівасьці (Язык Пскова, 194). Правільна таксама хорма 1-ае ас. мн. л. **есмя** прызнана за ноўгарадзкую, яна стрэлася толькі ў трох памятках, з каторых у ваднэй асаблівасьцяў пскоўскіх няма (Пагодзінск. № 1413), другая сьпісаная з ноўгарадзкага арыгіналу (ноўгарадзкі летапіс зб. Сынод. бібліотэкі, № 154), а трэйцяя (2-ая часьць зборніку Сынодальнае бібл., № 53 (255) мала мае рысаў пскоўскіх.

Але й болей пашыраную хорму 1-ае ас. мн. л. **есмо** нельга прызнаць за пскоўскую. Яе нямашака памеж іншага ў памятках XIV й першае палавіцы XV стг. Апрача таго, хормы **есмо** ня было ў паўночнай групе дыялектаў беларускіх. Гэтая хорма была ў старабеларускай мове літаратурнай з паўднявой групы дыялектаў беларускіх улучна з дыялектам сярэднім і ў памяткі пскоўскія магла лучыць толькі беларускім уплывам літаратурным.

Гэткім парадкам менаванымі пяцьма рысамі, каторыя подле Карынскага мелі-б сьветчыць, што, да XIII стг., Беларусаў у Пскоўшчыне ня было, памяткі XIV стг. із задзіночанага гаспадарства беларускага згаджаюцца з памяткамі пскоўскімі XIV стг.

З даследаваных Карынскім памяткаў пскоўскіх у зборніку Софійскае бібліотэкі № 1262 можна было знайсьці зьясьненьне таго, што мяшаньне **ы й и** ў памятках пскоўскіх адбівала правапісны ўплыў паўднёва-славянскі (заходне баўгарскі а сэрбскі). У памятцы гэтай канца XIV або пачатку XV стг. ё зыркія пскоўскія рысы (звыш 600 прыпадкаў мены **ч** і **ц**, звыш 200 прыпадкаў мены **з — ж, с — ш**) і няма правапісных рысаў паўднёва-славянскіх. Побач із гэтым у ей «мена **ы** й **и** встречается как исключение и примеры этой мены не заслуживают доверия: мнимым**ы**, ненавидимым**ы**, 95. 2, лукавым**ы**, 15 адв. 2». Гэта рыса ё таксама ў некаторых гаворках на прасторы б. задзіночанага гаспадарства беларускага. Значыцца, калі няма іншых правапісных рысаў паўднёва-славянскіх, дык няма й мяшаньня **ы — и**. А калі мяшаньне **ы — и** ў памятках пскоўскіх ня ё рысаю ўкраінскай, дык тым самым адпадае гіпотэза Карынскага праз магчымасьць перасяленьня да Пскоўшчыны паўночна-ўкраінскае люднасьці, бо й іншых ніякіх рысаў украінскіх у памятках пскоўскіх няма.

Шахматаў у менаванай працы «Несколько заметок...» паказаў, што некаторыя рысы памяткаў пскоўскіх — мяшаньне **ы — и**, мена **'а (я)** і **е**, мена **и** і **е** (абедзьве рысы асабліва пад націскам), мяшаньне складоў **ла, лу, на** і г. д. зь **ля, лю, ня** былі зьявамі правапіснымі, паўсталымі ў заходняй Баўгарыі а Сэрбіі на аснове тамашніх фонэтычных асаблівасьцяў, і літаратурнай дарогаю прынесеныя да Беларусі, дзе вытварылася такая школа пісьма; зь Беларусі лучылі да Пскова. Шахматаў, адылі, за далёка пайшоў у сваім крытыцызьме й некаторыя рысы — зацьвярдзеньне **р**, зьліцьцё **ѣ** зь **е**, хорму на **-мы** снадзіўнага склону мн. л. (прыкл. ненавидимымы) — ён мусіў прызнаць потым (прыкл. у «Введение в ист. рус. языка», б. 60) за жывыя зьявы дыялекту пскоўскага.

Напярэк Шахматаву бадай можна згадзіцца із Шэрахам, б. 45, 54—55, што прыпадкі аканьня пад націскам у памятках пскоўскіх адбіваюць зьявы жывое мовы, як астачы таго, што раней **о**, **е** пераходзілі ў **а**, **'а(я)** ня толькі ў складох ненацісьненых, але й у націсьненых. Гэтая-ж зьява — астачы аканьня пад націскам — адбіваецца і ў некаторых памятках беларускіх таго часу, што адцеміў і Шахматаў, але залічыў іх да рысаў правапісных і чужых.

Еракольскі ў вышменаваным артыкуле «Говор деревни Савкино...» зрабіў гэткі вывад што да нацыянальнае прыналежнасьці дыялекту пскоўскага ў цяперашнім яго стане: «Все это не дает нам права отнести изучаемый нами говор к севернорусским. Наш говор ближе за то стоит, кажется нам, к говорам беларусским, что не расходится с наблюдениями проф. Бузука, высказанными им в его работе «Да характарыстыкі паўночна-беларускіх дыялектаў. Гутаркі Невельскага й Вяліскага пав.» (б. 597).

Просьле ўсяго менаванага дзіўна, што Маскоўская Дыялектолёгічная Коміся не зважае на колькіяковую русыфікацу дыялекту пскоўскага і ўважае яго за пераходны з расійскай (паўночна-расійскай) асноваю і беларускім наслаеньням ды паклікаецца ня толькі на Карынскага, але й на Шахматава (Дурново — Опыт, 47).

Пры сваім разглядзе я буду браць даныя як із апісаных памяткаў пскоўскіх, так із запісаў цяперашняе мовы пскоўскае. Нельга не згадзіцца із Шахматавам, што адно тыя моўныя рысы памяткаў пэўныя, каторыя могуць быць пацьверджаныя цяперашнімі дыялектамі. У даным прыпадку, адылі, мусіць быць узяты пад увагу факт моцнага абрусеньня дыялекту пскоўскага. Дзеля таго трэба наперад дапусьціць, што некаторыя рысы дыялекту пскоўскага могуць быць болей або меней прыцертыя, і тады іх цяжка знайсьці ў цяперашнім яго стане, або й сусім сьцертыя, і тады іх трэба глядзець у найбліжшай якасна да дыялекту пскоўскага прасторы.

Як было зацемлена вышэй, Шахматаў зьясьніў некаторыя рысы памяткаў пскоўскіх правапісным уплывам паўднёва-славянскім, ідучым пасярэдніцтвам задзіночанага гаспадарства беларускага,дзе вытварылася такая школа пісьма. Але, апрача дзівосных рысаў, былі яшчэ такія рысы, што знаходзілі падзьдзяржаньне ў фактах мовы. Да такіх рысаў належылі: пераход ненацісьненых **о**, **е** ў **а**, **'а(я)**, пераход ненацісьненага **е** ў **і**, пераход **ѣ** у **е**, зацьвярдзеньне мяккога **р** і некаторыя іншыя. Прыпадкі такіх зьяваў у большай або меншай меры мусілі паходзіць із жывое мовы, а ня толькі адбіваць наносны правапіс. З гэтым згаджаецца й Шахматаў, 137, кажучы, што «некаторыя з гэтых прыпадкаў зьясьняюцца ўплывам паўднёва-славянскіх арыґіналаў». Другое, калі згадзіцца із Шахматавам, што кадзе менаваныя рысы ё толькі адбіцьцём беларускае школы пісьма, то прыкладаў на гэтыя рысы ў памятках пскоўскіх ня мае быць болей, чымся ў памятках задзіночанае Беларусі, а прымеж таго станаўко іх тамака болей. Такі звышак можна толькі залічыць да адбіцьця жывое вымовы пскоўскае. Пры дасьледаваньню пскоўскіх, як і іншых асаблівасьцяў беларускіх, трэба яшчэ мець наўвеце, што ўжо з пачатку XV стт. у задзіночанай Беларусі вытварылася літаратурная мова зь яе моцна ўстаноўленымі нормамі пісьма. Мова гэтая нівэлявала мясцовыя асаблівасьці, сьпярэчныя ейным нормам. Асабліва нівэляцы падпалі характарыстычныя рысы паўночнае групы дыялектаў — мена **ч** і **ц**, **ж** — **з**, **ш** — **с** і распадабненьне ў

ваканьню, бо яны былі надта выразьлівыя, але ня увайшлі ў склад рысаў літаратурнае мовы, каторая паўстала на подзе тае ўсходняе часьці дыялектаў сярэдніх, што займалі тэрытору паўднявое Полаччыны.[6]

Пачынаючы з 2-га дзесятка XV стг., характарыстычныя рысы паўночнага нарэчча беларускага — мена **ч і ц, ж — з, ш — с,** хорма **есме** 1-ае ас. мн. л. — у памятках полацкіх чэзнуць (Станґ — Полацк, 92—93), праяўляюцца адно ў некаторых памятках як рэдкія абмылы іх пісароў. Прымеж таго пісьменства аднапляменных Крывічоў пскоўскіх, арганізаваных у вапрычонае гаспадарства Вялікі Пскоў, адно ў малой меры паддалося ўплыву старабеларускае мовы літаратурнае; бачым гэта з багатага адбіцьця ў памятках пскоўскіх характарыстычных рысаў пскоўскіх, як мена **ч і ц, ж — з, ш — с,** а таксама пераход **дл** у **гл** і **тл** у **кл**. Дзеля таго трэба спадзявацца, што й іншыя рысы беларускія адаб'юцца ў памятках пскоўскіх болей, чымся ў памятках «Літвы». Так яно й ё запраўды.

Пераходжу да разгляду асобных рысаў дыялекту пскоўскага, галоўна тых, што сьветчаць праз яго беларускасьць, і асабліва тых, што вызначаюць яму месца сярод дыялектаў мовы беларускае.

ФОНЭТЫКА

1. Аканьне. Усі згаджаюцца з тым, што ў памятках пскоўскіх, як жывая зьява дыялекту пскоўскага, ё пераход ненацісьненага **о** ў **а**.[7] Дзеля таго ўважаю гэтта лішнім прыводзіць прыклады. Выразьліва аканьне праяўляецца ў XIV стг., зн. у найстаршых захаваных памятках пскоўскіх, і багата адбіваецца ў стагодзьдзю XV.

Ужо гэта адно прынукае дапушчаць, што таксама ненацісьненае **е** ў тэй або іншай меры ў старой мове пскоўскай перайшло ў **'а(я)** або, накш кажучы, перайшло ў **'а(я)**, пакольні не перайшло ў **і**, бо, першае, мы ня знаем такое мовы, дзе-б толькі ненацісьненае **о** перайшло ў **а**, а **е** засталося бязь зьмены; другое, у цяперашнім дыялекце пскоўскім таксама **е** перайшло ў **'а(я)**.[8]

Дзеля таго нельга згадзіцца із Шахматавам, калі ён чысьленыя прыпадкі пераходу ненацісьненага **е** ў **'а(я)** памяткаў пскоўскіх прызнаець за правапісныя. Калі Шахматаў кажа, што «псковская письменность находилась (разумеецца, не раней палавіцы XIV стг. — Я. С.) под непосредственным влиянием западно-русских памятников» (б. 136), альбо нат псковічы спісавалі з арыгіналаў беларускіх (б. 112), а з другога боку, што ў памятках беларускіх прыпадкаў зьмены **е** ў **'а(я)** меней, чымся ў пскоўскіх («в белорусских памятниках, скажем, XV в., отражающих несомненно акающие говоры, случаев замены **е** через **я** сравнительно немного» (б. 137), то прынамся розьніца памеж колькасьцю прыпадкаў мены **е** ў **'а(я)** памяткаў беларускіх і пскоўскіх мусіла паходзіць ад самога дыялекту пскоўскага. Прычыны гэтае розьніцы я паказаў кагадзе.

---

[6] Полаччына з гледзішча пляменнага й дыялектычнага была неаднолькавай: у самым Полацку і на поўнач ад яго жылі Крывічы і нарэчча было паўночнае, як у Віцебску а ў Смаленску, а ў тэй-жа Полаччыне, крыху на паўдня ад Полацку, ужо былі Дрыгвічы з моваю, што сталася прашчурам цяперашняга сярэдняга дыялекту мовы беларускае.

[7] Сабалеўскі 155; Карынскі, 199 і інш.; Шахматаў, 175.

[8] Гл. Дурново-Опыт, 37.

Дзеля таго ня толькі «Возможно, конечно, что некоторые случаи замены **е** через **'а(я)** должны быть об'яснимы, как акание (ср. замену **о** через **а** в псковских памятниках)» (Шахматаў, б. 137), але напэўна такія прыпадкі былі,[9] і колькасьць іх мусіла быць ня меншай, а большай за гэную розьніцу.

У памятках пскоўскіх XIV стг. ё, меж іншага, гэткія прыпадкі **а**, **я** замест ненацісьненага **е**: Друкарскі Псалтыр, №34: былъ ако ноцьный вранъ на нырыща; Друкарскі Псалтыр, № 35: не убоится сердца мое 46 адв., крѣпится серца твое 47, отца сыне святый душе 101 адв. (клічны склон); Зборнік Сынодальнае бібліотэкі № 154: бише чаломъ, 65 адв.; Параклітык 1369: радуйся всемирноя слово 10 адв., на древя пригвоздился 22 адв., въздержа в чревя злое невъздержание 44 адв.; Пролог 1383 г.: дѣтища сыи 56, дионисово капица 67 адв.[10] Пры падобных прыпадках пераходу **е** ў **а**, **я** і такія, як — десница твоя и мысца твоя и просвѣщения лица твоего, Псалтыр № 34 адв.; ты еси светъ и въскрьсения всемъ и живот, Параклітык 1369 г., 23 — і шмат іншых падобных сусім добра могуць быць паходжаньня пскоўскага. Падобна ў памятках беларускіх Вялікага Княства Літоўскага.

Зацемлю, што ў менаваных памятках няма пэўных рысаў, аднолькавых із украінскімі. У Псалтыру № 34 ані няма мены **ѣ** і **и**, **и** і **ы**; у Псалтыру № 35: всих вразех 20 адв. **и** ё асабліваосьцю морфолёґічнай, як наагул гэтая хорма ў мове беларускай (гл. ніжэй у ваддзеле морфолёґі), **прид** нимь 41 адв. трэба так разглядаць, як і **при** замест **пре**, наймя: Беларусы пры сваім аканьню, хочучы вымавіць ненацісьненае **е**, вымаўляюць **і** або **ы**. У Прологу 1383 г. прыклады: прѣльстьныкы 29, кныгы 30, насытылся 51 адв. — яўныя абмылкі ў пісаньні (**ы** пад уплывам **ы** суседняга складу), а з аднаго прыпадку исполнывъ 25 нельга рабіць ніякіх вывадаў. Таксама там-жа при законопрѣступнѣцѣ 23 адв. выглядае на абмылку ў пісаньню (**ѣ** пад уплывам **ѣ** наступнага). У Прологу 1383 г. свирильник 3 адв., свирили 16 адв., -лныя 16 адв. могуць быць рысаю беларускай (**і** замест **ѣ** пад уплывам **р**, **л**, альбо, накш кажучы, пад уплывам словаў із складамі -лі-, -ры-, -ір-, як сьліза, трываць, міргаць, прыр. цяперашнія беларускія хормы словаў перанятых: арышт, рыштант, адрыс, канцыляра, цырамоня, кілішак, кірмаш, кірунак), а иминию, там-жа 25 адв. — абмылка ў пісаньню або асабліваосьць ноўгарадзкая.[11] У Параклітыку 1369 г.: на лони аврамли — відавочна рыса ноўгарадзкага паходжаньня.[12]

Што да **е** (або **ѣ**) на месцу ненацісьненага **'а(я)** у раньніх памятках — Параклітык 1369 г.: неувѣдущюю 17, стежа 52, хіба клѣтвѣ (націск мог быць на канцы слова, пр. блр. бітвá, кляцьбá); Евангеля ад Лукі 1409 г.:

---

[9] Так глядзіць на гэтае пытаньне, меж іншага, вучаньнік Шахматаў, проф. Вс. Ганцов у працы «Особенности языка Радзивиловского списка летописи», б. 133. (ИОРЯС Акад. Наук. т. 32, 1927).

[10] З вынятками прыкладу із Зборніку № 154 Сынод. бібл., узятага з Карынскага, ўсі іншыя прыклады ўзятыя із Сабалеўскага, бб. 126, 129, 134, 137.

[11] Прыклады ўзяты із Сабалеўскага, 129, 137.

[12] Сабалеўскі, б. 144 праз разгледжаныя ім памяткі пскоўскія кажа: «большая часть псковских рукописей, описанных нами выше, как нам кажется, восходит к новгородским оригиналам, и встречающееся в них изредка **и** на месте **ѣ** может быть или признаваемо за принадлежащее новгородскому говору, или об'ясняемо, как происшедшее из неударяемаго **е** (в том лѣти, запись Апост. 1309—1312). С **исти** Апост. 1307 ср. ср. великор. **исть** = **есть**».

марие же магдалыни и марие осиова зряста 11 адв. — звычайная звышправільнасьць; а ў XV стт. і пасьлей — Пагодзінская копія лет. пск.: Ерославъ 201 адв.; Пскоўскі судовы ліст: в пѣнезех 25; Палея 1477 г.: паметь 246; Палея 1494: кладезю 311, кладезь 132, светилище 249 адв. і шмат іншых — зьява не фонэтычная, як думаюць вышменаваныя дасьледаваньнікі, а правапісная мена ненацісьненага **я** на **е**, вытвараная на грунььце аканьня.[13]

Якога тыпу аканьне было ў дыялекце пскоўскім — недысыміляцыйнае ці дысыміляцыйнае? Цяпер у часьці Пскоўшчыны аканьне недысыміляцыйнае, у другой часьці **а** ё толькі ў першым складзе перад націскам, а ў засталых — рэдукаваныя самагукі альбо **ы** (Дурново, Опыт, 37). Зважаючы на гэтую частковую сучасную дысыміляцыйнасьць і на тое, што ў суседніх ляпей захавалых дыялектах беларускіх Віцебшчыны, а нат Цьвершчыны, з каторымі, як пабачым далей, дыялект пскоўскі лучаць блізу ўсі рысы, дысыміляцыйнае аканьне захавалася дагэтуль, можна было-б сказаць, што дысыміляцыйнасьць у ваканьню пскоўскім была. Праз гэта сьветчыла-б таксама чэзьненьне на нашых ачох дысыміляцыйнасьці ў ваканьню Віцебшчыны.[14]

Як спачатку пераконуюча паказаў ван Війк,[15] адлі паглыбіў Шэрах, 28 і наст., спачатна (беларускае) аканьне было недысыміляцыйнае і адно пасьлей часьць яго, наймя паўночнае нарэчча, распадобнілася. Дзеля таго, што дыялект пскоўскі, як пабачым ніжэй, належа да паўночнага (накш паўночна-ўсходняга) нарэчча мовы беларускае, выглядае, што адначасна і ў ім мела стацца распадабненьне ў ваканьню. Ці, адылі, так напэўна сталася? Як гісторыя аканьня паказуе, можа яно зь недысыміляцыйнага абарачацца ў дысыміляцыйнае й наадварот. Зьясьненьне ўмоваў быцьця цяперашняга недысыміляцыйнага аканьня часьці мовы Пскоўшчыны прывяло-б можа да разьвязаньня пытаньня, якім — дысыміляцыйным ці недысыміляцыйным — яно было ў мінуласьці; адгэнуль быў-бы толькі сіг да даведаньня тыпу аканьня ўсяе Пскоўшчыны ў мінуласьці. Пытаньне на карысьць дысыміляцыйнасьці, прынамся тае часьці дыялекту пскоўскага, дзе цяпер аканьне дысыміляцыйнае, разьвязуе хорма на **-эю**, **-ею** прымальнага склону адз. л. прыметнікаў жаноцкіх (гл. крышку ніжэй ля гэтае хормы).

Што да дысыміляцыйнасьці аканьня па мяккіх сугуках, дык пераход ненацісьненага **е** ў **і** ў складох перад **а** і ў складох па націску, з выняткам канцавых адкрытых, сусім пэўны.[16] Шмат меншае адбіцьцё гэтае рысы ў памятках з прасторы задзіночанае Беларусі зьясьняецца выцісьненьням яе там на пісьме старабеларускай моваю літаратурнай.

Праз тое, што ненацісьненае **о** і **е** (або **ѣ**) ужо перайшлі ў **а** (паколькі не перайшлі ў **ы**, **і**), сьветча пераход спакменьніка ніякага роду да роду жаноцкага, каторы знаходзім у прыкладзе: и съзва от всѣх **всю** чаду на-

---

[13] Гл. праз гэта Станкевіч — Аль Кітаб, 14—15.

[14] П. Кузьмин — Материалы для изучения говора Велижского уезда (ИРЯС III—I, 1930, б. 179).

[15] Zur Entwicklungsgeschichte des Akanje und Jakanje (Slavia XIII, 1934/35, 634, 657, 659, 660, 663).

[16] Прыкладаў множасьць, зь іх таковыя, як радуиться 19 адв., емлиши 75 адв., ирѣтика 93 адв. (усі з Прологу 1383 г.); гнитягуть 78, господь мои отемлить строение дому от мене 117 (усі зь Евангелі ад Лукі 1409 г.) і іншыя сусім выглядаюць на адбіцьцё зьявы жывое народнае мовы.

рочиту, Зб. Сынод. бібл. № 154, б. 248. Пр. у сучаснай мове Пскоўшчыны: зьжамля зь нёбай; какая дзеріва (Ерапольскі, 590, 592).

Пэўне, што й пераход мужчынскіх **о**-асноваў із канцавым **-о** ў назоўным скл. адз. л. да **а**-асноваў стаіць у зьвязку з аканьням: Зб. Сынод. бібл.: посадник кюрила сндрѣевич 124 адв. (пры кирило 131).

Пераход ненацісьненага **у, 'у(ю) ў а, 'а(я)** ў прымальным склоне адз. л. паказуюць напісаньні: мокрою волну, Ірмологіён 1344 г. І адв. (Карынскі, 146), побудною пѣснь въспѣвающе, Зб. Соф. бібл. 1262; в послѣднѣю оубо муку 58 адв., там-жа (Карынскі, 132) і шмат іншых. Прыр. даўнейшыя й цяперашнія агульна пашыраныя (з выняткам паўднёва-заходніх гаворак паўднявога нарэчча) хормы беларускія прымальнага склону адз. л. на **-ыю** або **-аю** зь ненацісьненымі **-ы** або **-а** (бачу белыю або белаю хату, сінію або сіняю паперу й інш.), дарма што пішам **-у, -ю** — белую, сінюю.

Пад уплывам **а** ненацісьненага канчатку прымальнага склону адз. л. прыметнікаў з націскам на аснове паўстала ў тым-жа канчатку **а** націсьненае ў дыялекце пскоўскім. Пісалі **о**, але мусіла быць вымаўляна **а**, бо вымаўлянае **о** ў канчатку разгляданага склону нійдзе ня знойдзена, дый яно немагчымае пры аканьню.[17] Апрача таго, цяпер у дыялекце пскоўскім усі жаноцкія прыметнікі **з націскам на канчатку** канчаюцца ў прымальным склоне адз. л. на **-эю, -ею:** йінэю вясну (Ерапольскі). Хорма на **-эю, -ею** прымальнага склону адз. л. магла паўстаць толькі з **-ыю,** як цяперашнія хормы пскоўскія й паўночнага нарэчча мовы беларускае на **-эй:** старэй, маладэй, такей — паўсталі з хормаў на **-ый, -ій.** Нат у некаторых гаворках пскоўскіх і ў некаторых із прасторы б. задзіночанага гаспадарства беларускага зьявілася **-эй** замест **-ый** у дзеясловах. З апошняе прасторы ё запіс **Крэй Божа** ув Арлянятах Ашмянскага пав.; ад гэтага й жэрдка, каторую кладуць на хрыбет страхі, завецца там-жа «крэйка. К р э й запісана таксама ў пав. Наваградзкім, крэй, крэю — у Мядзьведзічах Баранавіцк. п. Цікава, што гэтыя мясцовасьці не належаць да паўночнага нарэчча, але Арляняты да гаворкі Віленска-Ашмянскае, а засталыя да паўднёва-заходніх гаворак. З гэтага відаць, што разгляданая зьява ў сваім першым пачатку ўсебеларуская. З дыялекту пскоўскага **мэю, нэю, крэю, мэем, крэем, мэй, крэй, нэй** (з мыю, крыю і г. д.) падаець Ерапольскі. Прычыну гэтае зьявы трэба бачыць у васлабленьню **ы.** Значыцца, у дыялекце пскоўскім мусіла быць хорма **-ыю** з націскам і бяз націску на **ы** — у канчатку прымальнага склону адз. л. прыметнікаў. **-ыю** паўстала з націсьненага й ненацісьненага канчатку **-аю,** як цяпер ёсьць агульна (але бяз націску) **-ыю, -ію** (новыю, сінію) ў паўночным нарэччу беларускім. Калі-ж у Пскоўшчыне **-аю** перайшло ў **-ыю,** дык там было аканьне дысыміляцыйнае, найменей у часьці, дзе й цяпер яно дысыміляцыйнае, дарма што ня сусім.

2. **Пераход о ў у.** Шырака ведамы ў гаворках беларускае народнае мовы пераход ненацісьненага **о** ў **у** ў канчатку сназдіўнага склону адз. л. жа-

---

[17] Што можа зьяўляцца **а** націсьненае пад уплывам аналёгі **а** ненацісьненага, маем прыклад у некаторых гаворках сярэдняга дыялекту беларускага, дзе ё хормы кага, чага, яга, майга, твайга, свайга, аднага, сягадня, сягалета. Тут пад уплывам аналёгі **а** ненацісьненага з **о** ненацісьненага канчатку дакладнага (роднага) скл. адз. л. (новага) **о** націсьненае ў канчатку менаваных займёнаў перайшло ў **а** націсьненае, а ў дыялекце пскоўскім націсьненае **у** канчатку прыналежнага скл. адз. л. перайшло ў **а** націсьненае пад уплывам **а** ненацісьненага з **у** ненацісьненага таго-ж канчатку прыметнікаў жаноцкіх із націскам на аснове.

ноцкіх прыметнікаў а спакменьнікаў, адбіваецца таксама ў памятках пскоўскіх. Прыклады: вълною морьскую, Ірмологіён 1344 г., 56 адв. (Карынскі, 46); чрѣвноую болезнью, Зб. Сынод. Бібл. 68/270, 20 адв.; четвертоую женою 440, новую повѣстью 23 адв., вѣрую то хвалить 152 адв. і шмат іншых. Таксама ў сучаснай мове Пскоўшчыны «частые случаи в именах женского рода на **-а** окончаний **-уй:** за горуй, ложкуй, жонкуй, с приметуй» (Ерапольскі, 590). Прычына гэтае зьявы ў тым, што, пад уплывам аналёгіі **о** націсьненага ў снадзіўным склоне адз. л., Беларусы стараюцца вымавіць **о** ненацісьненае ў тым-жа склоне, але, ня маючы яго ў сваёй мове, замест яго вымаўляюць **у.** Таго-ж роду зьява ёсьць у злучу **хуч** (Ерапольскі, 597), паўсталым із **хоць.**[18] Значыцца, першая прычына гэтае зьявы — таксама ў ваканьню.

3. Самагукі о, а перад вуснавымі (лябіяльнымі) сугукамі лябіялізуюцца ў **у:** умрачишася, Друкарскі Псалтыр № 35 (Сабалеўскі, 137); будрьнъ, Пролог 1383 г., 39 (Сабалеўскі, 130); омоучивше ж двернии праг, Палея 1494 г., 168; от моужаиска града, Зб. Сын. бібл. № 154, 132 адв., мужаескъ, там-жа 149 адв.; **а** перайшло ў **у:** асоурянi и воувилоняни, Палея 1494 г., 395 (Карынскі, 12, 66). Сюды-ж із сучаснае мовы Пскоўшчыны належа мугла (Ерапольскі) з мыгла. Рыса гэтая пашыраная ў народных гаворках беларускіх і асабліва моцна праяўляецца на Палесьсю, дзе нават замест займя I-ае ас. **мы** вымаўляюць **му;** крыху яна лучыла й да сучаснае мовы літаратурнае (прыкл. смурод, смуродзіна).

4 Як у мове беларускай наагул, **е** па мяккіх сугуках перад **ш, ж, ч, ц** не пераходзе ў **о:** цешча, Загорская вол. Хомскага пав. (Труды № 12, 135), нясеш, Ерапольскі, 591. Ґаршек, пятацэк, пясэцік паўсталі пад уплывам такіх памяншальных, як гаршчэчак, мяшэчак, бычэчак, у каторых **е** перад **ч** не перайшло ў **о.** Уцемный, Загорская в. (Труды № 12, 135) **е** не перайшло ў **о** (**ё**) перад зацьвярдзелым **м** (**тьмьнъ**); гэтак і ў Аль Кітабе (гл. Станкевіч-Аль Кітаб, 20).

5. **ѣ** у дыялекце пскоўскім зьлілося зь **е.**[19]

6. ъ, ь перад **й** перайшлі ў **у, і:** у назоўным скл. адз. л. прыметнікаў: злый, худый; у дзеяслоўных хормах: мый (загадны лад), мыю (цяп. час), крый, крыю, шый, шыю; у спакменьніках: шыя, памыйкі (усі прыклады ўзяты з Дурнова Опыт, 37); памыи, Зб. Сынод. бібл. 53/255 (часьць першая) Карынскі, 116. Да гэтага дадам: у дакладным склоне мн. л. і-асноваў: въ

---

[18] Я назіраў у гаворцы сяла Кушляны Ашмянскага пав., што там ня толькі вымаўляюць **у** замест ненаціс. **о** ў канчатку снадзіўнага склону, але таксама займя **што,** ужыванае ў ролі злуча, вымаўляюць як **шту.** Прыкл.: Што ты зрабіў? Але: Казалі, шту ты гэта зрабіў. У Арлянятах таго-ж павету кажуць, прыкладам: Гэту хустку нашу паштудзень.

[19] Пр. Сабалеўскі, 144: «По всей вероятности, в псковском говоре XIV в. уже не существовало **ѣ**, как звука отличного от **е**, и буквою **ѣ** в псковских рукописях обыкновенно означается звук **е**». Шахматаў: «Весьма замечательно полное отсутствие буквы **ѣ** в нашей грамоте (ліст пскоўскага князя 1463—5 г.); думаю, что это доказывает полное совпадение **е** и **ѣ** в одном звуке: ср. подобное совпадение в белорусском. Как известно, ряд белорусских памятников XIV–XV в. совершенно не употребляют буквы **ѣ**. Ср. в нашей грамоте: суседомъ, пресного, на городе, на кеской улици (Кѣсь древнее название Виндавы), прыехав, и т .д. Ввиду этого показания памятника характера нелитературного, я убеждаюсь в том, что замена **ѣ** через **и** в литературних памятниках древнего Пскова обязана влиянию или оригиналов этих памятников, или определенной школе письма» (Грамота Псковского князя Ивана Александровича. ИРЯС, XVII — 3—4, 1912, б. 347).

вѣчных двѣрии стерегуть (Карынскі, 135). Таксама канцавы **ь** 3-яе ас. адз. й мн. л. перад **й** пераходзіў у **і**; адгэтуль паўсталі такія хормы, як побивахути и, Апостал 1309-12 г. 10 (Сабалеўскі, 124), бияхуті и за ланиту, Евангеля ад Лукі 1409 г., 147 (Сабалеўскі, 142).

7. Злучэньні **ль, лъ, рь, ръ, мь, мъ, вь** із слабымі **ь, ъ,** будучы памеж сугукаў, перайшлі ў **лі, лы** і г. д.: не клините (загадны лад), Параклітык 1369 г., запіс (Сабалеўскі, 126), Пролог 1425 г., запіс (Карынскі, 140); не клинить (загадны лад, замест **-те**), Апостал 1309-12 г. (Сабалеъскі, 123); не клинете, Евангеля ад Лукі 1409 г. (Сабалеўскі, 139); клинеть (3-яя ас. адз. л.), Зб. Соф. бібл. 1262, 55 адв.; чресъ законъ божии заклинѣться человѣкъ, там-жа, 56 адв. (Карынскі, 133), з **кльн-;** трими (снадзіўны склон), Палея 1494 г., 2, 5, 333 адв. (Карынскі, 19), з **трьмі,** пр. цяперашнюю хорму блр. **трыма;** хитричемь, Палея 1477, 508 адв. (Карынскі, 51), з хытрьцьмь (снадзіўны склон адз. л.); зри за **осми** листов уперод, прыпіска XV стт. ў Зб. Сынод. бібл. 53/255, з осмь (**ь** апынулася памеж **м** і сугукам наступнога слова). З часам у мове беларускай хорма **восьмі** загульнілася, значыцца, стала ўжывацца й перад самагукам наступнога слова; у Аль Кітабе ё толькі хорма **осьмі** назоўнага склону адз. л. (Станкевіч-Аль Кітаб, 27). Сюды-ж належа I-ая ас. адз. л. **есми-** звычайная хорма падпаможнага дзеяслова памяткаў пскоўскіх. **Яблыко,** Зб. Соф. бібл. 1262, 86 адв. (Карынскі, 134), **-лы-** тут, побач із інышымі гэтае катэгоры прыведзенымі прыкладамі, сусім выглядае на адбіцьцё жывое вымовы, дарма што ў іншых, разгледжаных Карынскім памятках пскоўскіх таго-ж часу ё **яблоко.** У іншых магло быць занесена з Ноўгараду. Апрача таго **ъ** мог перайсьці ў **о** ў дакладным скл. мн. л. (яблъкъ), дзе быў у палажэньню моцным, скуль дарогаю аналёгі лучыць у **яблоко.** Із сучаснае мовы Пскоўшчыны прывяду **мугла** (Еропольскі) з **мьгла,** пр. блр. **мыгла; у ў мугла** пад уплывам **м.** Магчыма, што **-лы-** з **лъ-** ёсьць у **глып, глыпкій** (Еропольскі), зн. было-б з **глъб-** (**ъ** а ня вялікі юс), пр. блр. **глыб, глыбокі, глыбіня.**

Карынскі, з выняткам аднаго **яблыко,** не дагледзеў менаваных прыпадкаў з **лі, рі, мі** і г. д. і ўважаў, што **ль, лъ рь** і г. д. перайшлі ў дыялекце пскоўскім у **ле, ло, ре, ро** і г. д. (бб. 134-135). Таксама Шэрах. Апошні на довад гэтага прыводзе, што **Пльсковъ** а **Мьда** не перайшлі ў **Пліскаў** а **Міда** (бб. 53-54). На гэта можна адказаць, што ў **Пльсковъ ль** выпала з прычыны частага паўтараньня гэтага назову пскоўскае сталіцы. Што да **Мьда,** дык пачатныя **ль, лъ, рь, ръ, мь, мъ** рэдка ў мове беларускай пераходзяць у **лі, лы** і г. д., а звычайна перад сабою разьвіваюць **і-** (імшара, імша, імне, побач зь **місьцюк** ё **імсьціцца,** таксама **ірваць, ірдзець** і інш.). Не паўстала-ж хорма **Імда,** відавочна, з тае прычыны, што назоў гэтае ракі часта ўжываўся з прыймёнамі, каторыя згулялі тую-ж ролю, што й прыймёны-прэфіксы, просьле каторых менаваныя гукі не разьвіваюць перад сабою **і-** (ірваць, але парваць). З тае-ж прычыны з Ръша (стары назоў места Воршы) ня ўзнікла Ірша.

8. Калі пачатныя **л, р, м** стаяць перад шчэзлымі **ь, ъ,** дык перад **л р, м** разьвілося **і-:** Еропольскі: иржица, ільду: Чарнышоў — Пскоў: иржи 165, ильняной, ирвуть 173.

9. **йь-** (із слабым **ь**) на пачатку слова шчэзла: Црковные (людзі) с Кобыля, с Поленския губы. Выпіс із кнігаў пскоўскіх XVII стт. (РФВ, 1913, б. 7). Зн., як у мове блр.

10. **-йь-** зь **ь** моцным унутры слова перайшло ў **е**: яецка, Ерапольскі, 597, зь **яйьчько;** меж Троецких вод. Выпіс із кнігаў пскоўскіх XVII стг. (РФВ, 1913, б. 7). Гэтак-жа ў мове беларускай.

11. Празь пераход **у ў ў** і **в у ў** было зацемлена вышэй. Гэтая рыса вельмі моцна адбіваецца ў памятках.[20] Гэты-ж пераход ё і на канцы складу, прыкл.: траўка, кароў (Труды № 12, 135).[21] Калі ў апынецца памеж сугукаў, дык яно, ня могучы быць вымаўлена, чэзьне: Зб. Соф. бібл. 1262: възратятся 3 адв., не възратил ся 15 адв., прыкладаў шмат (Карынскі, 138). Як звышправільнасьць ё възврастъ 46, там-жа, адв.; Евангеля Друкарскае бібл. № 18: взращю ся 38 адв., взращьщеся 31 адв. (Карынскі, 147); з възвра-; Палея 1494: чрълености 4, черленаа 24 адв. (Карынскі, 58), — з чрвл- (з **р** складатворным). Гэткія а падобныя прыклады ў іншых памятках (Карынскі, 86, 107, 118, 126). Пр. цяперашнія блр.: першы зь првышьйь (з **р** складатворным), бярно зь бървьно.

Рэдчае пісар, ня маючы для **ў** асобнага знаку, перадаець яго пераз **оув:** и сташа оув источника, Палея 1494, 464; пировѣ оув церкви да не бываютъ, Зборнік Соф. бібл. 1262 і некаторыя іншыя.

Прыростак въз- з прычыны пераходу **в у у** або **ў** і шчэзьненьня слабога **ъ** зьмяніўся ў **уз-** або **ўз-:** оузваниемь, Зборнік Соф. бібл. 1262, 63 адв. (Карынскі, 135); узвеличися, Параклітык 1386 г., 107 адв. (Сабалеўскі, 133); оуздали, Паґодзінск. пск. лет., 133 адв., не оуздерьжять, там-жа, 114 (Карынскі, 83) і інш.

12. **Націск:** Ерапольскі: дачка́, вады́, коней,[22] бе́руць, падве́рнецца; Федарава: руку́, нагу́, на зямлю́, на гару́, пад гару́, заня́л, прыня́л, было, спа́ла, сасна́ (Труды № 12, 134); Загорская вол.: руку́, нагу́, на руку́, за нагу́, на зямлю́, пад гару́, заня́л, прыня́л, прыняла́, спа́ла, (Труды № 12, 136); нікога, нікому, нічога (Дурново-Опыт, 99); віхор. Ерапольскі, 589. З хормы морьскую вълною, Ірмологіён, 344, 56 адв. (Карынскі, 146) відаць, што націск на **-о-** морская, бо накш **о** ў канчатку снадзіўнага скл. не перайшло-б **у у.** Увесь прыведзены націск аднолькавы з націскам беларускае мовы літаратурнае і із звыш дзевяцёх дзясятых гаворкаў беларускае мовы народнае.

З выняткам колькіх словаў — коней, морскі — гэта націск новы, ён разьвіўся прыраўнальна нядаўна ў мове беларускай, так што нават яшчэ не абняў усяе мовы беларускае. Зь яго відаць, што мова Пскоўшчыны не пераставала жыць і разьвівацца ў кірунку беларускім, дарма што яе русыфікавалі.

Зь мяжыслоўнае фонэтыкі

Протэтычнае **в** перад **о а у:** вужьники, Апостал 1307 г., 110 (Сабалеўскі, 121); праз гэта сьветча, як звышправільнасьць, жиоучи, Судовы ліст 23 (двойчы) (Карынскі 93), замест живоучи; Ларивонович, Зб. Сынод. бібл. № 154, 202, 203, Паґодзінск. Пск. Лет., 186; ларивоновича, Пскоўскі ліст 1463-5 г.

[20] Колькі прыкладаў: въ вѣчных двѣрии стерегуть, Зб. Соф. бібл. 1262, 35 адв. (Карынскі, 135); вдержалъ, Ліст 1463 г. (ИРЯС XVII – 3–4, 1912, б. 348); Загорская вол.; ўдаріць, ўкрасьць (Труды № 12. 135); Федарава: ўмець, ўдавіць, там-жа, 134. Ерапольскі: наўціўся.

[21] Пр. Шахматаў (ИРЯС, XVII — 3—4, 1912, б. 348. Сабалеўскі, 149.

[22] Ерапольскі зварочуе ўвагу на ўплыў гэтага націску на Пушкіна: «Ко́ням, барин, тяжело́».

(ИРЯС, XVII, 3-4, 1912 г., б. 349); левонтей, Зб. Сынод. бібл. № 154, 221 адв. Із сучаснае мовы: Ерапольскі: вуліца, вўлей, вугор, вутка, Воля (пам. ад Вольга), воўцы, вокунь; Федорова: вокны, навука (Труды № 12, 134); Загорская вол.: воўцы, вуліца, вохра (Труды, № 12, 135).

На пачатку слова перад **а** спачатным і **а** зь ненацісьненага **о** (у памятках яно **о** этымолёґічнае й правапіснае) протэза бывае толькі па прыймені **ў, у:** Палея 1477 г.: где оув осла рога, 416 адв., оувалериянъ 581 адв., 582 (Карынскі, 54); Зб. Сынод. бібл. № 154: заложиша городъ каменъ оув орѣшка 1302; Паґодз. пск. лет.: оу града, оув опоки 17 адв., а псковичи тогда бяше оув орешка 28 адв., оув опоки 38, оув опочкомъ конци 157 адв. Што перад пачатным **а** прыстаўное **в** бывае толькі па прыймені **ў** або **у,** відаць із таго, што Псковічы ніколі ня звалі сваіх местаў Варэшак, Вапока (або Вапочка), але заўсёды Арэшак, Апока, Апочка (бяз **в** на пачатку), а пісалі Орешак, Опока, бо правапіс быў традыцыйны, царкоўна-славянскі. Што да прыстаўнога **в** пр. Я. Станкевіч — «Прыстаўное **в** у мове беларускай» (Родная мова, у Вільні, 66-75).

Перад пачатным **і,** паўсталым ізь ненацісьненага **йь-,** ё протэза **й:** йинэю вясну. Ерапольскі.[23]

Ёсьць у мове пскоўскай і протэтычнае **і-** да прыймені-прыростку **з** (з **йьз** а **съ**): ізьдзелаць. Ерапольскі, 589.

Па прыймёнах перад займем **йь** няма (паходзячага ад прыймёнаў) **н: з** йім, к йім (усюдых без прыстаўнога **н**). Ерапольскі, 591.

Як бачым, мяжыслоўная фонэтыка дыялекту пскоўскага — беларуская.

У памятках пскоўскіх часта ўжываецца **і** памеж словаў: Евангеля № 3 Друкарскае бібл.: исходя же изъ града того отрясѣте **и** прахъ отъ ногъ вашихъ 13 (тут можна зразумець, што **і** ўжыта дзеля падчыркненьня, замест «таксама»); иже на кровѣ **и** да не слазить взяти 34; и приступиль обяза **и** струпы 88 адв.; и дадите **и** милостыню 93; да **и** послеши 99 (Карынскі, 148); Зб. Соф. бібль. 1262: вѣдѣ разбоиника... приемша **и** отпущение 25 адв.; бегливаго тѣкущаго **и** присно к грѣху 26 адв.; не возмогоша **и** его яти 28; что **и** есть оже глаголеть 48; а внидоша **и** жерци 86, і інш. (Карынскі, 137). Таксама ў колькіх іншых памятках.

Калісь, за хлапецкіх год, даводзілася мне чуць, што мой дзед часта, здавалася без патрэбы, ужываў **і,** але не магу сказаць, ці было ў яго ўжываньне падобнае да ўжываньня меж словаў **і** ў памятках пскоўскіх.

Сугукі

1. Кв перад ѣ з ой. У мове беларускай часткава захавалася група **кв**- перад **ѣ з ой.** Ё гэта ў вагульна-пашыраным слове **кветка, квяцісты,** у назове **Кветунь** аднае мясцовасьці ў пав. Трубчэўскім на Севершчыне. Нат на абруселых прасторах беларускіх — у Тульшчыне, Варанежчыне, Куршчыне — ведамная гэта асаблівасьць (А. Крымский — Древне-киевский говор, 399. ИОРЯС XI-3, 1906), знае яе й дыялект пскоўскі (Крымский, там-жа).

2. Праславянскія злучэньні дл, тл у дыялекце пскоўскім захаваліся безь пераходу ў **л** і пасьлей зьмяніліся ў **гл, кл.** Прыклады з памяткаў: при-

---

[23] Тут-жа зацемлю, што ў дыялекце пскоўскім, як наагул у мове беларускай, захавалася (спачатнае) **й** ў слове **юшка** (Ерапольскі, 584). У мове рас. у гэтым, як і ў іншых, прыпадку пачатнае **й** адпала — **уха.**

вегли есме невѣсту тобѣ, Палея 1494 г., 334 адв.; привегли, Палея 1477, 422; и многихъ христіанъ присѣкли и в полон свегли, Сынод. бібл. № 154, 203 адв.; полоняниковъ привегли к великому князю, Паґодз. пск. лет., 147; рече им не чькли есте яко створи богъ. Зб. Соф. бібл. 1262, 57 адв. і шмат іншых (Карынскі, 58, 72, 85, 137 і інш); от жерегла малым частым неводом на берегу к Роскапели а острову Заечю от жерегла не ловит нихто ... меж Троецких вод от жерегла топи ... Выпіс із пскоўскіх кнігаў XVII ст. (РФВ, 1913, б. 7). **жерегло** із **жердло**, гэта тое-ж слова, што агульна-беларускае «жарало». Тут жараглом завецца ўток Мды ў Чудзкое возера ў Пскоўскім павеце.

З часам гэтая асаблівасьць дыялекту пскоўскага шчэзла пад уплывам расійскім, **гл, кл** былі заступлены неорганічна гукам **л**, адно захаваліся астачы ранейшае вымовы ў некаторых словах, як **жагло** із žędło[24] — жыгала, **мыгла** (запіс Ант. Адамовіча ў Тарапцу), — мыла. **Мыгла** перайшло таксама да эстонскае мовы й захавалася ў хорме **могель, мугель** «луг».[25]

Групы **дл, тл** былі захаваны толькі ў дыялекце пскоўскім, іншыя дыялекты беларускія гэтае асаблівасьці ня знаюць. Але пераход **дл** у **гл, тл** у **кл** ё рысаю агульна-беларускай.[26] Агульна-беларускай ё хорма дзеяслова **сустракаць**, каторая сваім **к** стаіць у зьвязку з пскоўскім **кл** (стрэк, стрэклі замест стрэў, стрэлі). Таксама агульнабеларускае **жыгала** сваім **г** стаіць у зьвязку із пскоўскім **жагла.**

Шахматаў пскоўскія **дл, тл,** з каторых **гл, кл,** выводзіў ад мовы «польскіх плямёнаў», што, як ён дапушчаў, жылі ў Пскоўшчыне да прыходу туды «усходня-славянскае люднасьці». Але як добра зацеміў I. Polívka (Slavia, I, 1922/23, б. 121), каб, прыкладам, польскае zrzódło ператварыць у жарагло, трэба знаць прыраўнальную граматыку славянскіх моваў. Надабе згадзіцца із Сабалеўскім а іншымі, што разгляданая пскоўская рыса захавалася з пары праславянскае. А калі згадзіцца з Трубецкім, што ў заходня-славянскіх мовах **дл, тл** дзеля таго захаваліся, што памеж гэтых гукаў пачаў праходзіць склададзел (Zsl. Ph., II, 117-121), дык гэтая рыса была перажыта пскоўскім дыялектам у пару праславянскую супольна із заходня-славянскімі дыялектамі, што ані ня дзіўна ў суцэльнай яшчэ, хоць дыялектычна здыфэрэнцыяванай мове.

3. **Пераход ґ у г.** На вялікай бальшыні тэрыторы цяперашняе мовы пскоўскае ё ґ, але памяткі пскоўскія сьветчаць праз **г:** Зб. Соф. бібл. 1262: осподьство 81 адв., осподии своихъ 83; Праўны ліст 1483 г.: осподою, осподинъ; Паґодз. пск. лет.: осподара 194, о осподарю 212 адв., осподар 219 і інш. Зб. Сынод. бібл. № 154: осподарь 129, осподаря 197 адв., 208, осподарю 219 і інш. (Карынскі, 72, 86, 138, 142). Праз **г** светчаць такія прыклады із сучаснага дыялекту пскоўскага, як янёнак (Ерапольскі, 589) — ягнё, у каторым магло выпасьці толькі **г** (ягнёнак). З гэтага відаць, што спачатна ў дыялекце пскоўскім было **г** (а ня ґ), пасьлей заступленае, пад уплывам

---

[24] Пр. Дурново — Введение в ист. рус. языка, I, Брно, 1927, 121.

[25] Пр. Шахматов (РФВ, 1913, б. 10).

[26] Пр. Шахматов, вынаска: «Переход **д** в **г** в таком положении не чужд белорусским говорам, где находим **вяглiна** из польск. вэндлина; **а** для Пскова он доказывается формой проклѣеть в Софийском № 1262, л. которая строит, конечно, вм. протлѣть в фразе: «аще бо не всееши пшеница ни прочихъ семенъ в землю, то не проклѣеть, ни плоды створить; аще ли в земли сътлееть, то плод створить».

расійскім, гукам ґ. Дагэтуль захавалася толькі ў вадзіночных словах, як ѓáркі (такі, што добра гарыць), гайнуць (гукáць), назоў сяла Гайкі (Ерапольскі, 558), мыгла (мыла, запіс Ант. Адамовіча ў Тарапцу). Апрача таго, у ўсіх словах на суцэльнай прасторы г захавалася ў дыялекце пскоўскім на трэйцяй часьці Ржэўскага павету (Труды № 9, 1927, б. 9).

4. **Пераход л у ў.** У сучасным стане дыялекту пскоўскага няма пераходу **л** у **ў**, але даўней, відавочна, **л** у палажэньню ля **ъ**, у тым ліку ў дзейным дзеепрыметніку мінулага часу (part. praet. act. II), было перайшоўшы ў **ў**. Відаць гэта зь цяперашняе хормы ў Пскоўшчыне дзеепрыслоўя мінулага часу (part. praet. act. I): паелшы, сказалшы, приляцелшы й г. д. (Ерапольскі, 591), хормы памяткам пскоўскім нязнанай; там гэтае дзеепрыслоўе ніколі ня мае **л**.[27] Відавочна, Псковічы, хочучы, пад расійскім уплывам, вымаўляць **л** у дзейным дзеепрыметніку мінулага часу замест свайго ў (казаў з казалъ), пачалі вымаўляць **л** і ў дзеепрыслоўю мінулага часу, бо ў вадным і другім прыпадку мелі ў сваей мове ў. У памятках пскоўскіх на пераход **л** у **ў** мог-бы сьветчыць прыклад **молвчите.** Палея 1494 г. (Карынскі, 29). Пераход **л** у **ў** захаваўся ў дыялекце пскоўскім у поўнай сіле на трэйцяй часьці павету Ржэўскага, часьці найменей зрусыфікаванай (Труды № 9, 1927, б. 9).

5. **Злучэньні здй, зѓй** перайшлі ў дыялекце пскоўскім у **ждж,** праз што сьветчаць такія прыклады, як **дошч** (Труды № 12, 134). Цяпер, адылі, пад расійскім уплывам, ё звычайна **жж** на месцу **здй** а **жѓй**. У памятках пскоўскіх на месцу менаваных злучэньняў досыць часта сустракаецца **жг** — побач із цсл. **жд.** Ё, праўда, памяткі, у каторых **жг** няма, а толькі **жд.** З малымі выняткамі **жг** знаходзім у слове **дожг** (дождж) і паходзячых ад яго (дожгь, надъжгити, Апостал 1307 г. і інш.). У сучаснай мове пскоўскай гэтага злучэньня няма, там **дошч,** як зацемлена кагадзе, зн. як наагул у мове беларускай — **дошч,** дажджу (пішацца дождж, дажджу й г. д.). Дзеля гэтага ў групе **жг** памяткаў пскоўскіх трэба бачыць уплыў ноўгарадзкага правапісу: ня маючы ў альфабэце сяродку дзеля перадаваньня **ждж,** пскоўскія пісары перадавалі яго праз **жг,** пераймаючы іх у Ноўгарадцаў, але ў Пскове іх вымаўлялі накш, чымся ў Ноўгарадзе.

6. **Зацьвярдзеньне р.** На зацьвярдзеньне **р** ё множасьць прыкладаў у памятках XV стг. (гл. Карынскі, 32, 71, 84, 105, 117, 125, 136). Шмат меней, але досыць, каб сконстатаваць зацьвярдзеньне **р,** знаходзім прыпадкаў у памятках XIV стг.: перад **а:** симона оусъмара, Апостал 1307 г., 25; градъте, Параклітык 1386 г., 69; як звышправільнасьць: грядящии (град-), Евангеля ад Лукі 1409, 123; зацемлю, што ў менаваных памятках няма мены **а** : **я** па іншых сугуках. Перад **у**: буру, Параклітык 1369 г., 83; вечеру творяше, Евангеля Друкарск. бібл. № 18, 93 адв., і там-жа як звышправільнасьць: горюшну зерну 60; у гэтых дзьвюх памятках няма мены **у** : **ю** па іншых сугуках. Перад **і:** гризениемь, Параклітык 1369 г., 81 адв. — звышправільнасьць; па іншых сугуках няма мены **и** : **ы** ў гэтым рукапісе. Рызы, Пролог 1383 г., 62 адв., звышправільнасьць там-жа: открити 16, риб 35 адв., Рибарь 97; па іншых сугуках прыпадкі мены **и** — **ы** ў Прологу 1383 г. лёгка зьясьняюцца як абмылы ў пісаньню. покриваемъ, Параклітык 1386 г.,

---

[27] «Причастные формы уже заменились деепричастными с окончанием — вшие, -шие». Каринский, 192.

45; два прыпадкі **и** замест **ы** ў гэтым рукапісе па іншых сугуках — поживе непостыжимии 50 адв., въ пустини 74 — яўныя абмылы ў пісаньню.[28]

Цяпер у дыялекце пскоўскім ё звычайна **р** мяккое, але спорадычныя прыпадкі з **р** зацьвярдзелым[29] паказуюць, што ўперад у Пскоўшчыне было ўсюдых **р** зацьвярдзелае.

7. **Зацьвярдзеньне вуснавых** на канцы слова й перад сугукамі, у згодзе із сучасным дыялектам пскоўскім,[30] зырка выражана ў памятках. Прыкладаў множасьць. Прывяду колькі: Палея 1494 г.: црковъ 39 адв. і інш., скорбъ 68, голубъ; Палея 1477 г.: скорбъ 56, голубъ 61 адв., роуфъ 311, оудобъ II. I іншыя (Карынскі, 9, 46, 65, 98).

8. **ж, ш, ч, шч, ц цьвярдыя** як у сучасным[31] так і ў старым дыялекце пскоўскім. У памятках з прычыны традыцыйнага правапісу ня ў кажнай гэтае зацьвярдзеньне праяўляецца аднолькава моцна, але даволі, каб можна было яго з пэўнасьцяй сконстатаваць.[32]

9. **Літара щ** у памятках пскоўскіх, відавочна, вымаўлялася як **шч**, хоць цяпер пад расійскім уплывам вымаўляецца й **шш** побач із **шч**.[33]

10. **Дзеканьне а цеканьне** захавалася дагэтуль у дыялекце пскоўскім. Гэта сьцьвярджае Маскоўская Дыялектолёгічная Комісія ў сваім «Очерку русской диалектологии» (Дурново-Опыт, б. 37), Ерапольскі, б. 588 і іншыя. У памятках таксама ё прыклады на гэтую зьяву: азоцьстіи, Палея 1494, 246 адв. (побач собскае імя азоти), Карынскі, 34; и се сила бяше град окручила и коніи и колясница, Палея 1477, 446; имного болѣвшю есть расчиснустася ему челюсти и оустнѣ его не сведостеся, там-жа, 543 адв.[34] (Карынскі, 56). У Палеі 1477 г. ё мена **ч** й **ц** і **ч** шмат часьцей замяняе **ц**, чымся наадварот. Праз гэтую-ж рысу сьветча й **хуч** (Ерапольскі, 597) з **хоць** і завярежіць із заверэдзіць (там-жа, 594). Значыцца, **дзь ць** вымаўляліся зьліжана да **дж, ч** мяккіх. Цяперашнюю вымову іх сьцьвярджае Маск. Дыял. Комісія: «мягкие **ц, дз** из **т, д** мягких также способны абращаться в **ч, дж** мягкие: джѣчи» (Дурново-Опыт, 38).

11. Як наагул у мове беларускай, **н** у суфіксе **-іна** абстрактных спакменьнікаў зьмякчылася: шириня, Палея 1494 г., 322, Зб. Сынод. бібл. № 154, в шириню, там-жа II адв. (Карынскі, 27).

---

[28] Прыклады ўзятыя із Сабалеўскага, 120, 126, 127, 133, 142 і з Карынскага (Евангеля Друк. бібл. № 18), б. 147.

[29] Ерапольскі, 588: дверы, крык, крычаць, звярушка, рынулся, пірастал. Чарнышоў — Псков, 172, 180; діравый, Чарнышоў — Асташкаў.

[30] Загорская вол.: кроў, сем, убʼю, пʼю (Труды № 12, б. 136); пʼянкый, Ерапольскі.

[31] Федарава: чыстый, чарві, малчы, там-жа **шч** цьвярдое (Труды № 12, 134). Пр. Ерапольскі, 588 і Дурново-Опыт, 37.

[32] Пр. у Пскоўскім судовым лісьце: «После шипящих и **ц** находим часто **оу** и **ы**: за жывот 21 (двойчы), положыть II, позыеницы 7 (двойчы), на оулицы 7, исцу 22, на исцы 10 (Карынскі, 93). У Пагодз. пск. лет. «Твердость шипящих и **ц** обозначается нередко: нѣмцы 3 адв., творцоу 5 адв., 25 адв., коупцы 188, моужъ 8, 21, 36 адв.; тысящъ 47 адв.; вашъ III адв., нашоу 142 адв., роубежу 144 (Карынскі, 83). Пр. таксама Карынскі, 54, і інш.

[33] Пр. Сабалеўскі, 149: «Исъчепли (у Параклітыку 1383 г. — Я. С.) произошло, конечно, из ишчепли; употребление в этом слове **сч** вм. **щ** указывает, по нашему мнению, на то, что буква **щ** в псковских памятниках XIV в. передает звук **шч**, а не **шш**».

[34] А ў Палеі 1494 г. гэтак: растиснустася ему челюсти и оустьне ся его не свесте, 438 адв.

12. **Здваеньне сугукаў.** Асыміляцу **й** да папярэдняга мяккога сугуку па шчэзьненьню **ь** адбіваюць прыклады: **десятю, заечю.** Выпіс із пскоўскіх кнігаў XVII стт. (РФВ, 1913, б. 7). Відавочна тут быў здоўжаны сугук, каторы, адылі, як гэта ёсьць у памятках із іншае тэрыторы беларускае, пісары звычайна не абзначалі. Прыклады на здваеньне із цяперашняе мовы пскоўскае: треттий, Чарнышоў-Пскоў, 171, 174.

13. **Мена або зьліцьцё ч і ц, ж і з, ш і с; вымова зь, сь.** «В значительной части говоров **ц** и **ч** совпали в одном звуке **ц** твердом или шепелявом **ц** твердом; в некоторых немногих говорах в звуке **ц** мягком или шепелявом звуке, близком к **т** мягкому. В другой части говоров существуют оба звука и **ц** и **ч**, при чем **ч** в таком случае может произносится твердо, как и **ц**; эти звуки частью различаются правильно, частью смешиваются: чэлый при цэрвяк. Более архаичными следует считать говоры, в которых **ц** и **ч** совпали» (Дурново-Опыт, 37). Затое пскоўскія **зь, сь** ляпей апісаны ў Ерапольскага: «Звук **з** мягкое произносится с легкою шепелявостью, как склонный к **ж**: зжмяя, зжяелёный. Обратно: жзяелезо и др.» «То же следует сказать о **с**, произносимом как **сш**: сшиний, сшизый, сшилязень. **Сш** бывает обыкновенно перед гласным мягким» (б. 588).

Да гэтага можна толькі дадаць, што, як і ў паўночнай дыялектычнай групе прасторы б. задзіночанага гаспадарства беларускага, у мове пскоўскай спорадычна сустракаюцца прыпадкі мены **ж-з, ш-с** цьвярдых, прыкл. здати замест ждати (Сабалеўскі, 120).

Менаваныя рысы вельмі багата адбіваюцца ў памятках пскоўскіх ды тым балей, чым меней у іх чужога ўплыву.

Мена або зьліцьцё **ч й ц** і зьліжаная да **шь ж** мяккіх вымова **сь, зь** або зьліцьцё — таксама чэзнуць у Пскоўшчыне, адно, здаецца, памалей, чымся ў Полаччыне, Віцебшчыне а Смаленшчыне. Але ў некаторых мясцовасьцях нат баржджэй. Гэтак Кузьмін у вышменаваным артыкуле апісуе таксама мову Тарапецкага пав. Пскоўшчыны і траха сусім не знаходзе ў ім мены **ч і ц**, затое ў пав. Вяліскім Віцебшчыны менаваная мена пануе. Не зазначае Кузьмін вымовы **сь, зь** зьліжанае да **ш, ж** мяккіх у тым-жа Тарапецкім пав., але прыклады на такую вымову прыводзе з пав. Вяліскага (б. 153). Нат у глухіх сёлах Хомскага пав. мена **ч і ц** ёсьць толькі ў суседзтве з высяленцамі з Астроўскага пав. (Труды № 12, 135). У вадказе з Лускага пав. на апытаньнік зазначана: «зрэдку сустракаюцца словы з **ч** замесьт **ц**» (Труды № II, 181). Гэткім парадкам у вапошніх дзьвюх зьявах ё поўная аналёга з дыялектамі смаленска-віцебска-полацкімі.

Дзеля таго што мена **ч-ц** ё рысаю таксама народнае мовы (паўночна) расійскае, часьць расійскіх лінґвістых уважае яе за расійскую і на моўнай тэрыторы беларускай, у тым ліку пскоўскай. Але апрача таго, што яна ёсьць у народнай мове расійскай, яны ня могуць прывесьці іншых арґумэнтаў. Гэтая рыса, адылі, ё ў бальшыні дыялектаў польскіх ды ў некаторых іншых мовах славянскіх, меж іншага, у дольне-лужыцкай а палабскай, а гэта паказуе, што супольнасьць яе ў часьці мовы беларускай із паўночна-расійскім нарэччам ня сьветча празь яе паходжаньне расійскае на тэрыторы беларускай. Таксама нельга згадзіцца із Шахматавам праз быццам польскае паходжаньне гэтае рысы ў Беларусі і ў Расіі. Калі-б так было, дык гэтая рыса была-б найболей пашырыўшыся на захадзе Беларусі, а прымеж таго яе там сусім няма.

зь, сь зблíжаных да **ж, ш** мяккіх і мены **ж-з, ш-с** мова расійская ня знае, але гэтая рыса пашырыўшыся ў гаворках польскіх і дольне-лужыцкай мове. Ніч (Nitsch) сьхінаўся да пагляду, што разгляданыя рысы ё дыялектычнай зьяваю мовы праславянскае.[35]

Уважаньне менаваных зьяваў за дыялектычна праславянскія ё чыстай гіпотэзаю, прымеж таго што да некаторых тэрытораў сьцьверджана гістарычна неславянскае паходжаньне разгляданых рысаў. Малэцкі ў сваей моноґрафіі праз харвацка-славінскую мену **ч** на **ц**[36] давёў, што гэтая рыса ў дыялектах харвацкіх паўстала як рэзультат сымбіёзы вэнэцкага дыялекту й харвацкае мовы, а ў мясцовасьці славінскай, каторай мова знае гэтую рысу, захавалася вымова даўнейшых тырольска-нямецкіх колёністых. Усюдых, дзе ё менаваныя рысы, можна ў вадных прыпадках дапушчаць, у другіх сьцьвярджаць быцьцё, да прыходу Славян, іншае стыхіі, неславянскае. Жывучыя на такіх землях неславянскія плямёны ня мелі ў сваей мове аднаго сугуку ў парах **ч-ц, ж-з, ш-с.** З гэтае прычыны ўзьнікла разгляданая мена-мяшаньне.

На паўночных тэрыторах славянскіх моваў з уплываў неславянскіх могуць быць прыйманыя пад увагу ўплыў ґерманскі, балцкі а фінскі. Ґерманскі ўплыў здаецца пэўны ў мове палабскай а дольне-лужыцкай, фінскі — у паўночна-расійскім нарэччу. Дыкжэ Аванесаў і прызнаець, што ў нарэччу паўночна-расійскім «звуки **ц** и **ч** заменились одним звуком **ц** в связи с языковым смешением славян и финских племен».[37] Уплыў балцкі магчымы дзеля таго, што ў мове прускай ё вымова дз замест **дж.** Прускі ўплыў на мову польскую трэба адкінуць, бо, першае, прускія Балты так далёка на паўдня ня жылі, а, другое, польскі антраполёґічны тып нічога ня мае супольнага з тыпам балцкім. Але паўстаньне ў мове беларускай менаваных рысаў пад уплывам балцкім рэч сусім пэўная. Балты былі субстратам народу беларускага, ды расьсяленьне Беларусаў а старавечных Балтаў на землях беларускіх пакрываюцца.[38] Мусіла тут быць пляма балцкае, у каторага мове ня было аднаго сугуку ў кажнай з параў **ч-ц, ж-з, ш-с.** Яно не захавалася, бо сталася субстратам беларускага плямені Крывічоў. Калі зьвернем увагу, што яшчэ ў XI-XII стагодзьдзях у Княстве Смаленскім, на ўсходнім яго паграніччу жыло балцкае плямя Голядзь — відавочна астача гэтага плямені, што яшчэ ня зьлілося зь беларускімі Славянамі, дык праўдападобна яно, гэтае плямя (а не адно яго астача) было субстратам беларускага плямені Крывічоў. З другога боку, ведама сярод Прусаў (прускіх Балтаў) плямя Голінды. Назоў «Голінды» ў мове беларускай нормальна зьмяняецца ў «Голядзь». Дык можна думаць, што Голядзь беларуская была свая Голіндам прускім і мела ў сваей мове менаваныя даныя, дзякуючы каторым у нарэччу крывіцкім разьвіліся разгляданыя гэтта зьявы. Іншыя плямёны балцкія сталіся субстратам іншых плямёнаў беларускіх. Што да разгляданых рысаў у мове польскай, то іх найлягчэй зьясьніць там уплывам мовы люднасьці ґерманскае, што жыла на цяперашняй тэрыторы польскай

---

[35] Próba ugrupowania gwar polskich (Rozprawy Wydziału Filologicznego Akademii Umiejętności. XLVI, 1900).

[36] Cakawizm z uwzglednieniem zjawisk podobnych. Kraków, 1929.

[37] Р. Аванесов – Очерки русской диалектологии, Масква, 1949, б. 35.

[38] Гл. Я. Станкевіч — Савецкае хвальшаваньне гісторыі Беларусі, у Мюнхене, 1956, б. 8–18. Там-жа падана літаратура праз паходжаньне Беларусаў.

да прыходу туды Славян і, мабыць, часткава засталася па іх прыходзе. Гэткая гіпотэза праз уплыў на мову польскую субстрату ґерманскага здаецца мне праўдападабнейшай, чымся гіпотэза Бодуэна дэ Куртэнэ праз уплыў фінскі, да каторае сьхінаецца таксама Малэцкі ў цытаванай працы.

14. **Ф** перайшло ў **х** альбо ў **хв:** гахановичь, Паґодзінскі пск. лет., III, 129, 165 адв., 169, 194, гахановича, там-жа, 120, 142, 158 (Карынскі, 72, 85). Із сучаснае мовы: «Вместо **Ф** обыкновенно слышится **х:** хамілія, хабріка, Яхім, хунт, Пракохій, Вульх (Ерапольскі, 589); Федарава: Хвёдар, Хвіліп, Хёкла (Труды № 12, 134); Загорская вол.: Хёдар, Хаўронья, Хіліп (Труды № 12, 135).

15. **Дысыміляца. кт** распадобнілася ў **хт:** нихто. Выпіс із пск. кнігаў XVII стг. (РФВ, 1913, 7), хто, Ерапольскі, 593, з къто.

р, л распадобнююцца ў словах чужых: Люрик, Палея 1494 г., 439 адв., Трувол, там-жа. Таксама ў Палеі 1477 г. і іншых (Карынскі, 34, 57 і інш.).

КОЛЬКІ ДРАБНЫХ АСАБЛІВАСЬЦЯЎ

Ё канцавое і ў слове «маці» (Ерапольскі).

н у оустьне, Палея 1494 г., 438 адв.; оустьнѣ, Палея 1477 г. (Карынскі, 56). Пр. сучаснае блр. «вусны».

в у слове «освы», Ерапольскі (відавочна восвы). У мове блр. гэтак: назоўны скл. адз. л. — асвá, мн. л. — восвы.

м (а ня **н**) у некаторых імёнах: Мікалай, Мікуня (Ерапольскі, 589).

Ваевода ... того Микифорка орабилъ. Пск. ліст 1480 г. (Беляев — Рассказы из рус. истории, кн. III, Псков, б. 44).

Цьвярдое **н** у слове «амін», Параклітык 1386 г. (Сабалеўскі, 131), як у старой і цяперашняй мове беларускай наагул.

КОЛЬКІ РЫСАЎ ІЗ СЛАВАТВОРСТВА

Суфік **-і-** у васнове неазначаньнікаў відіті, смотріті: видити, Зб. Сынод. бібл. 53/255 (другая часьць), 157, видиша, там-жа, 287; оусмотривъ, Ірмологіён 1344 г., 40 адв., расмотрих, там-жа; оусмотристе, Палея 1494 г., 103 адв., расмотрити, там-жа, 472; расмотривше, Зб. Сынод. бібл. 68/270, видити, там-жа, 180, оувидивше, там-жа, 139 адв. «и др.» (Карынскі, 20, 68, 102, 122, 146, і інш.). Гэты-ж суфікс у памятках полацкіх: смотрити, осмотрити, видити (Станґ — Полацк, 43).

Суфікс **-а-** у дзеясловаў «слухаць», «сукáць»; суфікс **-я-** ў дзеясловаў «купляць» (Ерапольскі, 589).

Бяссуфіксная хорма неазначальнікавае асновы дзеяслова «раўці» (Ерапольскі).

Суфікс **-ен-** у множным ліку **-нт-** асноваў: кацяняты, гусяняты (Ерапольскі).

Памяншальны суфікс **ьце** ў оконце, Палея 1477 г., 60.

Прыростак **су-** (а ня **с**) у сусѣдъ, запіс Мінеі Сынод. бібл. № 173; сусѣд, Пскоўскі судовы ліст 15; соусѣди, Зб. Сынод. бібл. 68/270, 54 (Карынскі, 94, 105, 143).

МОРФОЛЕҐІЯ

Мужчынскія спакменьнікі на **-р, -л** із пярэднім сутукам канчаюцца ў назоўным склоне адз. л. на **-о:** князь александро, Зб. Сынод. бібл. № 154, 202 (Карынскі, 68). Таксама ў мове блр. наагул, ды ў вялізарнай бальшыні мовы народнае і ў мове літаратурнай такія спакменьнікі перайшлі да мужчынскік а-асноваў (Аляксандра, няма Аляксандры, бачу Аляксандру). Як відаць із прыведзенага вышэй прыкладу посадник Кюрила, із Зб. Сынод. бібл., відавочна, такі пераход да мужчынскіх а- асноваў стаўся і ў Пскоўшчыне.

Таксама мужчынскія хрышчоныя імёны памяншальныя із суфіксам **-ък** у мове беларускай канчаліся на **-о**[39] і таксама перайшлі да а-асноваў: Саўка, Янка, Сымонка, Міхалка і інш., няма Саўкі, бачу Саўку. Зь ня хрышчоных імёнаў належа сюды маршалка — таксама спакменьнік подле свае хормы памяншальны, а зь імёнаў з устаўным **ъ-** Марка. Як бачым із прыкладу — писал Марко (Параклітык 1369 г., запіс) — тое-ж ё і ў дыялекце пскоўскім.

о ё на канцы і ў назовах местаў прыметнікавага паходжаньня: изборьско, Зб. Сынод. бібл. № 154, 47 адв., 175, 204, Смоленско, там-жа, 144, 194, — дзеля таго, што разумеецца спакменьнік ніякага роду «места» (а ня «горад»). Карскі кажа: «В старинных западнорусских памятниках нередко видим (у назовах местаў) окончание средн. рода на **-о**: оу Полотеско, гр(амота) около 1300 г.; Крас.: Витебско, 75, 80, дал ему лоуцко 77 (8), мѣнско 88, на смоленско 90 и др. При всех таких названиях городов следует подразумевать слово «место», что в Литовско-Русском государстве, под влиянием польскога языка, обозначало «город» (Белорусы, II-3, 27). Карскі меў русыфікацыйныя тэндэнцы і там, дзе мова беларуская розьніцца ад расійскае, а прыпадкам зыходзіцца з польскай, часта — сьведама або нясьведама — гаварыў праз польскі ўплыў. Гэтак і тут, дарма што каля 1300 г. аніякага ўплыву польскага ў Беларусі ня было. Назовы местаў на -ско, як бачым, ё і ў мове пскоўскай, а прымеж таго ў Пскоўшчыне ніколі польскага ўплыву ня было.

Дакладны (родны) скл. адз. л. абстрактных і зборных мужчынскіх спакменьнікаў на **-у:** пскоўскі ліст 1463-65 г.: а искалъ на них животу брата своего; просилъ у нас исправе головника и животу и пива и меду;[40] Паґодзінск. пск. лет.: много животоу пограбиша 94 (Шахматаў, там-жа), меду 183, дару 109 адв., миру 112, до миру 133 (Карынскі, 88); Зб. Сынод. бібл. № 154: из риму 147, мироу не взяша 194 адв., «и др». (Карынскі, 73); Пскоўскі судовы ліст: грабежу не будет 7, своего закладу 9, до зароку 18 (Карынскі, 93-94). Із сучаснае мовы: от удару, із анбару, мёду (Ерапольскі, 590, 592).

Мясцовы скл. адз. л.: а) асабовыя спакменьнікі мужчынскія на **-у:** при федосу, Пролог 1383 г., запіс (Сабалеўскі, 127); при борису, Параклітык 1369 г., запіс; при борису, адрывак Парамейніка 1313 г. (Карынскі, 145);

---

[39] У паўднявой часьці паўднёва-заходніх гаворак у іх і цяпер ё гэты канчатак — Юрко (зь Юръко).

[40] Ш а х м а т о в праз гэта кажа: «Едва ли сколько-нибудь употребительны формы род. на -у от основ с ударением на падежных окончаниях в великорусских говорах, но в белорусских оне известны, напр., в старом языке: до четвергоу» (ИРЯС, XVII — 3—4, 1912, 348).

о сыну, Палея 1477 г., 384, о сыну, Палея 1494 г., 304 (Карынскі, 59); б) канчатак **-у** па **к, г,** мяккіх сугуках а **р:** Пск. судовы ліст: оу торгу 17, пиру 7; Зб. Сынод. бібл. № 154: въ полотьску 37 адв., на полку 242 адв., на волоку 379, на Днепру 372, о мироу 140; Пагодз. пск. лет.: в полочку 125, в воискоу 189 адв.; Палея 1477 г.: о миру 362, и пришед сѣде в градѣ сарихоу 340 (Карынскі, 59, 73, 88, 94). Із сучаснае мовы: у клівяру, на пню (Ерапольскі).

Аналёгічны самагук на месцу слабога **ь** ёсьць у **ляве,** Запіс Мінеі Сынод. бібл. № 173 (Карынскі, 143) з львъ, у прыкладзе заразом ё пераход **ь** у **'а (я).**

Назоўны скл. мн. л. мужчынскіх а ніякіх о-асноваў канчаецца на **-ы, -і:** горады, лесы, берагі (Дурново-Опыт, 38); рогі, сыны (спачатная кароткая у-аснова), вокны, вёслы (Ерапольскі). Так сама нт-асновы: кацяняты, гусяняты, вуцяняты (Ерапольскі).

Дакладны скл. мн. л. мужчынскіх о-асноваў мяккіх мае хорму на -еў (кароткіх ю-асноваў): царевъ, Палея 1494, 210; Пагодз. пск. лет.: пріателевъ, 153, рублевъ 97; Зборнік Сынод. бібл. № 68/270: носителевъ 269 адв., царев 203; Зборнік Сынод. бібл. 53/255 (другая часьць): молев 153, врачев (двойчы) 167 адв., звѣриев 99 адв.; Зборнік Соф. бібл. 1262: тропаревъ 14 адв. Зборнік Сынод. бібл № 154: царевицовъ 128 адв. (Карынскі, 38, 70, 88, 108, 119, 127). Із сучаснае мовы: Ерапольскі: мужоў, язёў, цароў.

Клічны скл. адз. л. а-асноваў у дыялекце пскоўскім XIV-XV стг. яшчэ быў. У памятках частая ё хорма господо й колькі іншых. У Прологу 1383 г.: възгласи ему честная она главо человеколюбивая (Сабалеўскі, 130, пр. Карынскі, 189). Націск хіба быў перанесены на канец слова — подле назоўнага скл. адз. л.

і-асновы канчаюцца ў мясцовым скл. мн. л. на **-ёх:** Ерапольскі: у гасьсёх (гасьцёх), у лашадзёх, сшянёх (сянёх).

Канчатак -ім, -ым у мясцовым скл. адз. л. прыметнікаў а займёнаў: Друкарскі Псалтыр № 34 з XIV стг.: въ сердци своимь 65 адв.; Зб. Соф. бібл. 1262: в бѣсящимся 101, о кающимся 90 адв., 19, о всякомь глаголѣ исходящимъ I адв., о владѣющимь I адв.; Пролог 1425: о мнисѣ впадшимь 101 адв., на стоящимь болванѣ 40 адв., о рожьшимся 162 і інш.; Зб. Сынод. бібл. № 68/270: о исходящимъ от земля огни 224 адв., о боудоущимъ 225, в граде семъ царьствоующимъ 3 (Карынскі, 108, 138, 141).

Снадзіўны скл. мн. л. прыметнікаў, займёнаў, радзей спакменьнікаў на **-мы:** Параклітык 1386 г.: выснимы силамы, дѣлы злымы (Сабалеўскі, 149); Палея 1494 г.: всимы силы црствы 211, сынмы хамовы 159, между сынмы первыми 157 адв.; Ліст 1463-65 г.: людмы, над нашимы Купцинамы.[41] Падобна ў іншых памятках пскоўскіх (Карынскі, 53, 82, 103, 123).

Займя 2-ое ас. а зваротнае маюць хормы з **-о-** ў прызн.-мясц. скл. адз. л.: собѣ въ здравие, Апостал 1309-12 г., запіс (Сабалеўскі, 122). Ерапольскі: табе, сабе.

Хормы займёнаў тъ, вьсъ, сь, самъ. У памятках: назоўны-прымальны **скл. адз. л.: мужч. роду** — тот, сесь, наз. скл. жан. р. — тая, ніякі р. — тое;

[41] Шахматаў: «Сопоставьте с этым -мы в белорусском друцком говоре: густымы борамы, з намы (Романов, Белор. Сборник, IV, стр. XV). Ср. другие указания у Карского Белорусы, II, 204». Дадам, што гэтыя-ж хормы ё цяпер і ў пав. Валожынскім Віленшчыны.

прым. жан. р. — тую; снадз. скл. муж. і ніякага р. — тым, усім, самым; наз. прым. мн. л. — тыі, усі, самы; дакл. -мясц. скл. мн. л. — тых, усіх, самых; прызначальны скл. мн. л. — тым, усім, самым; снадз. скл. мн. л. — тымі, усімі (Карынскі, 192). Ерапольскі: тая, тое, тым, тыі, усі, усіх (б. 591). Загорская вол.: усім (Труды № 12, 135).

Зь лічнікаў адцемлю: с двѣма на десятьма тысящьма, Евангеля ад Лукі 1409 г., 94 (Сабалеўскі, 142); чатыры, Загорская в. (Труды № 12, 135).

Дзеяслоў. Калі неазначаньнікі на **-нуць** ня маюць значэньня момэнтальнасьці, дык у іх хорма на **-нуць** заступлена хормаю на **-ці:** мокці, Загорская вол. (Труды № 12, 136). Таковыя хормы вельмі пашыраныя ў гаворках беларускіх.

Хорма І-ае ас. адз. л. падпаможнага дзеяслова была **есьмі** (Карынскі, 192); хорма І-ае ас. мн. л. **есьме,** праз што была мова вышэй. Тэматычныя дзеясловы ў І-ай ас. мн. л. маюць хормы на **-м** (Карынскі, 193, Ерапольскі, 591), дзеясловы з асновамі цяперашняга часу на **о/е** маюць пад націскам перад канчаткам **-м** самагук **-е-** — нясем. Ерапольскі, 591.

Дзеясловы ў 3-яй ас. адз. і мн. л. маюць у памятках звычайна канчатак **-ть.** Пр. Карынскі, 193. Бяссумлеву радкія канчаткі **-тъ** заўдзячаюць сваё быцьцё ў памятках пскоўскіх чужому літаратурнаму ўплыву. У мове сучаснай канчатак **-ць:** будзіць, ходзіць, яны любюць, ён любіць, Загорская вол. (Труды № 12, 136).

У 2-ой ас. мн. л. загаднага ладу ё хормы на **-іце.**

НЕКАТОРЫЯ РЫСЫ ІЗ СЫНТАКСУ

Адно ў множным ліку ўжываюць спакменьнікаў дзьверы, каноплі, грудзі (Ерапольскі).

Род спакменьнікаў: красный яблак, густая пáра, какáя дзеріва (Ерапольскі, 590). съзва ... всю чаду нарочиту, Зб. Сынод. бібл. № 154, 248. Таксама ў памятках задзіночанае Беларусі чада жан. роду (Карскі, II-3, 23), а цяпер у мове беларускай яблык муж. роду, а пáра жан. р.

Замест прыймені **къ** ужываюць прыймені **до (да):** искаху и придоху **до** него, Евангеля ад Лукі 1409 г., 94 (Сабалеўскі, 142).

Таксама прыймя **до** ўжываецца замест прыймені **въ:** Іду **да** міліцыі, хадзі **да** зафхоза (Ерапольскі, 593).

Прыймя **за** ўжываюць і ў значэньню рас. через: зри за осми листов уперод, Зб. Сын. бібл. № 53/255, прыпіска XV ст., 93 адв. (Карынскі, III).

«У казьніку ўжываюць складаных прыметнікаў. Прыкл.: Яна была бальная; Ільля был глухей» (Ерапольскі, 592).

Пры вызначэньню мэты ўжываюць толькі неазначальніка: іці рыбе палавіць. Ерапольскі.

Ерапольскі і аўтары «Диалектологическай карты русскаго языка» (Дурново й інш.) кажуць, што ў мове пскоўскай замест мінулага часу дзеяслова ўжываюць дзеяпрыслоўе мінулага часу (нясклоннае part. praet. I): Яны ушолшы, яна поемшы (Ерапольскі, 593); Карова была цяліўшы (Дурново-Опыт). Ведама мне, што ў шмат якіх гаворках беларускіх, меж іншага ў віленска-ашмянскай, гэткіх хормаў ужываюць замест дзеяпрыметніка залежнага стану мінулага часу (part. praet. pass.) ў тых прыпадках, калі

выказуецца мінулы дзейны стан. Гэтак, прыкладам, кажацца **дзяцё памылася.** Калі хтось дзяцё памыў, дык яно (ёсьць) **памытае;** але калі дзяцё само памылася, дык яно (ёсьць) **памыўшыся.** Здаецца, што гэтак ужываюць і менаваных хормаў пскоўскіх.

Адцемлю злуч **чы:** а чи буду гдѣ помялъся... и вы отьци и братие исправляюче чтите, Пралог 1425 г., запіс (Карынскі); а чи где буду. описалъ ся. и вы. отьци. и братья. пойте. испраливаюця, Параклітык 1369 г., запіс (Сабалеўскі); чи где боудеть помятено или криво написано, Апостол 1309-12 г., запіс (Сабалеўскі).

Згодна з моваю беларускай, у дыялекце пскоўскім «наблюдается обилие слов с ласкательными суффиксами: малюхетный (маленький), николишиньки (никогда). Иногда к словам с суффиксами ласкательными или уменьшительными присоединяется частица **-ка:** таперинька, тутынька» (Еропольскі, 592).

З выняткам злучэньняў **гл, кл** із **дл, тл** усі менаваныя асаблівасьці дыялекту пскоўскага супольныя ў яго або з усей моваю беларускай, або з дыялектамі паўночнага (накш паўночна-ўсходняга) нарэчча мовы беларускае. Блізу ўсі гэныя асаблівасьці чужыя мове расійскай. Разгледзіўшы рысы мовы пскоўскае, нельга сумлявацца, што з гледзішча гісторычнага дыялект пскоўскі — чыста беларускі. У сучасным сваім стане ён — таксама беларускі, але вельмі зрусыфікаваны.

Зьліцьцё або мяшаньне **ч** і **ц, ж** і **з, ш** і **с,** вымова **зь, сь** збліжаная да **ж, ш** мяккіх, дысыміляцыйнае аканьне, зьліцьцё **ѣ** і **е,** хорма **есьме** І-ае ас. мн. л. паказуюць, што дыялект пскоўскі належа да паўночнае (накш паўночна-ўсходняе) групы дыялектаў беларускіх. Злучэньнямі **гл, кл** з **дл, тл** дыялект пскоўскі займае да некаторае меры апрычонае месца ў паўночна-дыялектычнай групе мовы беларускае, але ад іншых дыялектаў гэтае групы ён шмат меней розьніцца, чымся ўся гэтая група ад паўднявое дыялектычнае групы мовы беларускае.

ПАСЛОЎЕ

Зь невялічкімі выняткамі разгледжаныя памяткі пскоўскія напісаны моваю царкоўна-славянскай (стара-баўгарскай). Як наагул у памятках моваю царкоўна-славянскай, таксама ў такіх-жа пскоўскіх, рысы мовы жывое, у даным прыпадку беларускае, ёсьць у іх як адхіны ад мовы памяткі ды як недагляд і абмылы.

Аўтару гэтага артыкулу былі няпрыступныя арыгіналы памяткаў і яму давялося карыстацца цытатамі з памяткаў, прыводжанымі пярэднімі дасьледаваньнікамі; дзеля таго ля прыводжаных рысаў мовы мусіла быць паказана як месца іх у памятцы, так і месца ў пярэдняга дасьледаваньніка.

Пры друку з тэхнічных прычынаў ётаваныя літары мусілі быць заступлены літарамі **я, ю, е,** замест юсаў ужыты **у** або **я,** залежна ад вымовы юса, раскрыты цітлы, і літары, вынесеныя над радок, унесены ў радок. Дзеля таго-ж нельга было дакладней графічна абазначыць вымовы **зь, сь,** дабліжанае да вымовы **ж, ш** мяккіх, а ў ваканьню самагукаў пераходных **(а, 'а (я)** да **э, 'э (е), ы, і).**

СКАРАЧЭНЬНІ НАЗОВАЎ КНІГАЎ, ЦЫТАВАНЫХ АРТЫКУЛАЎ І МЯСЦОВАСЬЦЯЎ

Дурново: Опыт — Н. Дурново, Н. Соколов и Д. Ушаков. Опыт диалектологической карты русского языка в Европе, с приложением очерка русской диалектологии (Труды Московской Диалектологической Комиссии, V, 1915).

Еропольскі — Иеропольский. Говор деревни Савкино Пушкинского района Псковскога округа (ИРЯС, III-2, 1930).

Загорская в. — Загорская воласьць Хомскага пав.

ИРЯС — Известия по русскому языку и словесности Академии Наук.

Карынскі — Н. Каринский. Язык Пскова и его области в XV в. (Записки ист.-фил. фак. СПБ университета, 93, 1909).

Кузьмін — П. Кузьмин. Материалы для изучения говоров Велижского уезда (ИРЯС III-1, 1930).

РФВ — Русский Филогический Вестник.

Сабалеўскі — А. Соболевский. Очерки из истории русского языка. II. Псковский говор в XIV в. (Университетские известия, у Кіеве, 1884, № 1-2).

Станг: — Kanzleisprache — Ch. Stang. Die westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen, Oslo, 1935.

Станг: Полацк — Ch. Stang. Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk. Oslo, 1939.

Станкевіч: Аль Кітаб — J. Stankievič. Mova rukapisu Al Kitab Kryvickaha muzeju Ivana Łuckieviča ŭ Vilni. New York, 1954.

Труды — Труды Московской Диалектологической Комиссии.

Федарава — Федарава Болагаўскае вол. Вялікалуцкага пав.

Шахматаў — А. Шахматов. Несколько заметок о языке псковских памятников (Журнал Министерства Народного Просвещения, июль, 105).

Шэрах — Y. Šerech. Problems in the Formation of Belorussian (Word, vol. 9, 1953).

Чарнышоў: Пскоў — В. Чернышев. Псковское наречие (Труды Комиссии по русскому языку Академии Наук СССР, I, 1931).

Чарнышоў: Асташкаў — В. Чернышев. Говор города Осташкова (Материалы и исследования по русской диалектологии, 2, М.-Л., 1949).